незалежная газета

№ 3 (649) 20 студзеня 2009

www.nn.by

# Наша Ніва

першая беларуская газета

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднаўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Беларусы бягуць на Захад сотнямі**

Старонка 2




**Беларускае аўто для караля Іспаніі**

Старонка 11



**Сляды каралевы Боны**

Старонка 12


### У НУМАРЫ

**Чорны перадзел**

Раённыя ўлады забіраюць назад зямельныя ўчасткі, выдзеленыя людзям у пажыццёвае валоданне. **Старонка 4.**

**У БРСМ, «Белую Русь» — заганяюць, з апазіцыйных партый — выганяюць**

Шасці настаўнікам з Мінскай вобласці пагражаюць звальненнямі за палітыку. **Старонка 3.**

**Год таму Зімоўскі абяцаў Трусаву беларусізаваць БТ. І што?**

Алег Трусаў: Вынік года — рэгіянальныя навіны па-беларуску. **Старонка 7.**

**Яўген Афнагель і Павел Юхневіч: Людзі ў нас сапраўды вераць**

Людзі, якія былі ў «Зубры», гэта паказчык якасці, мяркуюць хлопцы з «Еўрапейскай Беларусі». **Старонка 7.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Па машыны ў Літву

Застаецца менш за паўгода на куплю машыны трохі танней. З 1 ліпеня Беларусь капітулюе перад расійскімі мытнымі тарыфамі. Паездка па аўтамабіль у суседнюю краіну дазволіць ашчадзіць каля тысячы еўра. **Старонка 8.**




## Сем тысяч даляраў, каб вярнуцца жывой і здаровай

Прыгоды беларусак у Тайландзе. **Старонка 9.**



# Садом і Гамора ў міліцыі і КДБ

У інтэрнэце забіў чарговы фантан кампрамату на беларускіх сілавікоў.

На сайтах зноў з'явілася скандальная інфармацыя пра карупцыю ў вышэйшых шэрагах беларускіх праваахоўных органаў.

У якасці асобы, якая раскрывае таямніцы, выступіў **былы капітан МУС Вячаслаў Дудкін (на фота)**. Не просты опер з раёна. Калісьці ён быў набліжаным да кіраўніка міністэрства Уладзіміра Навумава і вёў справу пра жахлівыя факты карупцыі ў канкурэнтнай структуры — КДБ.

Аднак Навумава знялі — у выніку дзейнасці Віктара Лукашэнкі, сцвярджае Дудкін, і ў маі мінулага года капітан вымушаны быў уцячы ў Расію. Там ён знаходзіцца і цяпер, хаваючыся ад беларускага камітэта дзяржбяспекі. КДБ, паводле слоў былога капітана, шукае яго «па спецыяльнай схеме».

Дудкін распавядае шмат цікавага. Маўляў, міністр Навумаў быў адзіным, хто насамрэч узяўся за раскрыццё карупцыі ў КДБ.



І падае канкрэтны прыклад, як мінская бізнэсвумен Ганна Доўгая, што трапіла ў турму за махінацыі, распавяла пра свае сувязі — усялякага характару — з палкоўнікамі КДБ М.Міхалапам і А.Мяцеліцам. Гісторыя тая заблытаная. Але ў выніку абодва палкоўнікі трапілі ў турму на працяглыя тэрміны. Што і пацягнула за сабой сапраўдную вайну паміж КДБ і МУС.

У гэтую вайну ўцягнутыя самыя розныя людзі: ад кіраўніка дзяржавы, які асабіста вызваліў Ганну Доўгую з турмы, да капітана Дудкіна.

Расказ Дудкіна здольны ўразіць любога нармальнага чалавека. Карціна, апісаная ім, нагадвае расійскія палітычныя дэтэктывы пачатку 1990-х. Вядома, да гэтых звестак варта ставіцца крытычна. У каментарах нейкая, без сумневу дасведчаная, асоба расказвае і пра грахі самога Дудкіна.

Наколькі прагніла беларуская дзяржаўная сістэма, калі МУС і КДБ, якія павінны бараніць закон і дзяржаву, спаборнічаюць у ачарненні адзін аднаго? Прычым для дыскрэдытацыі выкарыстоўваюць любыя метады. Перамагае той, хто здолее выкрыць большую колькасць злачынстваў, здзейсненых супернікам.

Меркаваць пра гэту прыхаваную вайну мы можам толькі па больш-менш гучных адстаўках і прызначэннях. Цалкам усе акалічнасці закуліснай вайны невядомыя нікому.

**Алесь Пілецкі**

# Мясцовыя выбары — 25 красавіка

**Выбары ў мясцовыя саветы дэпутатаў прызначаны на 25 красавіка. Адпаведны ўказ падпісаў Аляксандр Лукашэнка.**

Гэта будзе першая ў Беларусі выбарчая кампанія, якая пройдзе згодна з новым выбарчым заканадаўствам. Тым не менш, мясцовыя выбары пройдуць без міжнароднага назірання.

14 лютага пачнецца перыяд вылучэння кандыдатаў. Вылучацца кандыдаты ў дэпутаты могуць зборам подпісаў, ад палітычных партый, а таксама ад мясцовых органаў улады. Кандыдат павінен жыць ці працаваць на тэрыторыі, дзе збіраецца вылучацца. Выбарчая агітацыя пачнецца ад 26 сакавіка.

Зменшыцца сёлета і колькасць дэпутатаў. Чатыры гады таму іх было 22 661, а цяпер будзе 21 300. А вось у Мінску будзе на дзве акругі больш — 57.

Апазіцыя мае розныя меркаванні адносна таго, ці варта ёй удзельнічаць у мясцовых выбарах. Пастаянны ўдзельнік падобных мерапрыемстваў, лідэр барысаўскай філіі Партыі БНФ Сяргей Салаш, на выбары не пойдзе.

«З 2003 года я браў удзел у чатырох выбарчых кампаніях, падчас якіх меў электаральную падтрымку, якая, на жаль, так і не канвертавалася ў дэпутацкі мандат. Прычыны — вядомыя. Сёння я не хацеў бы праводзіць кампанію дзеля кампаніі», — кажа С.Салаш.

Салігорскі маладафронтавец Аляксей Валабуеў, наадварот, на выбары ідзе: «Хачу атрымаць досвед, які мне яшчэ спатрэбіцца. Байкот — гэта дысідэнцтва. А я ведаю, што прапанаваць людзям. Да байкоту буду заклікаць у выпадку маёй нерэгістрацыі», — кажа А.Валабуеў.

**Зміцер Панкавец**

# Беларусы бягуць на Захад сотнямі

**Сучасныя Астапы Бэндэры карыстаюцца тым, што ў Беларусі дыктатура.**

У 2009 г. у Швейцарыі 16 005 чалавек папрасілі палітычнага прытулку. Сярод іх 76 беларусаў.

Значна больш папулярнай за Швейцарыю для беларускіх эмігрантаў з'яўляецца Швецыя. Ад 2001 года аж 4000 беларусаў папрасілі палітычнага прытулку ў гэтай скандынаўскай краіне.

Першы скачок колькасці палітэмігрантаў з Беларусі адбыўся пасля выбараў 2001 года. Калі ў 2001 годзе іх было 331, то ў наступным ужо 722, а ў 2003 — 901. Пасля 2004 года назіраўся паступовы спад. У 2006 годзе колькасць палітэмігрантаў зноў вырасла: ад 372 да 432. За 2008 год да ўладаў Швецыі з просьбай атрымаць прытулак па палітычных прычынах звярнулася 361 асоба з Беларусі.




**Лічба асобаў, што папрасілі прытулак у Швецыі.**

Сярод уцекачоў практычна няма тых, хто сапраўды пацярпеў ад палітычнага ўціску ў Беларусі. Большасць імкнецца змяніць беларускі сацыялізм на шведскі, прыкінуўшыся «ахвярамі рэжыму». Для азначэння такіх эмігрантаў некалькі гадоў таму з'явілася слова «ўпырхлікі».

**Алесь Пілецкі**

## Сябры па Мытным саюзе падаюць прыклад

**Дачка прэзідэнта Казахстана купіла вілу ў Жэневе за $45 млн.**

Дынара Кулібаева — дачка прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева — купіла самы дарагі асабняк на беразе Жэнеўскага возера.

Дзялку зямлі плошчай 80 сотак, на якой размешчаны тры наземныя пабудовы і дзве падземныя канструкцыі, прадалі за $45 млн.

Дом раней належаў расійскаму бізнэсмену Рустаму Аксененку. У 2005-м ён набыў дзялянку за 12 млн.

Часопіс Forbes у 2007 годзе ўключыў Дынару Кулібаеву ў рэйтынг самых уплывовых людзей свету. Паводле падлікаў часопіса, капітал яе складае прыблізна $2,1 млрд.

Кулібаева займаецца дабрачыннасцю і ўзначальвае Фонд адукацыі Нурсултана Назарбаева. Яна замужам за Цімурам Кулібаевым, буйным прадпрымальнікам, кіраўніком KazEnergy і старшынёй Федэрацыі бокса рэспублікі.

**СГ**

## СЦІСЛА

### Насельніцтва ЕС перавысіла 500 мільёнаў

Год таму ў краінах ЕС жылі 499,8 млн чалавек. Найбольшая краіна ЕС — Нямеччына (81,7 млн жыхароў). На другім месцы —Францыя (64,7 млн). Трэцяе месца займае Брытанія з 62 млн. Насельніцтва Нямеччыны за апошняе дзесяцігоддзе не павялічвалася, тады як у Ірландыі і Іспаніі вырасла на 15%.

### Цыгана будуць судзіць па першай інстанцыі

Вярхоўны суд перадаў у Мінскі абласны суд матэрыялы крымінальнай справы былога кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёна сталіцы Міхаіла Цыгана. Яго вінавацяць у хабарніцтве і іншых злачынствах. Другой абвінавачанай па гэтай справе з'яўляецца пенсіянерка, што спрабавала даць Міхаілу Цыгану хабар.

### Вялікая прыхільніца Лукашэнкі выходзіць замуж

Абраннікам спявачкі Жанет стаў спартовец Павел. Ягонае прозвішча пакуль не раскрываецца. Цырымонія шлюбу Жанет Бутэрус і Паўла адбудзецца ў Мінску. Наогул, Жанет вядомая сваім непрыхаваным захапленнем Лукашэнкам. Чаго вартая яе фраза «Нам усім яшчэ трэба павучыцца ў яго спевам».

### У возеры Мядзел злавілі 8-кілаграмовага шчупака

Пашчасціла рыбакам Івану Кавяку і Уладзіміру Гірыну. І гэта яшчэ не рэкорд. Трапляюцца ў Паазер'і і пудовыя экзэмпляры. У любым разе, Івана і Уладзіміра чакае ладная юшка.

**СГ; БЕЛТА; БелаПАН; «Салідарнасць»; westki.info**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 6000 рублёў.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перaказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй падпісчыкам

**К.М., С.К., Л.Г., І.В., Нінелі В., В.П., В.Г., Д.К., А.В., В.Ц., Р.Г., Ніне Ш., Ю.П., Юрыю М., Б.М., Валянціне Г., Генадзю К., А.Р., Юрыю Л., Мікалаю К. Ігару Б., Ю.Б., А.Б., Уладзіміру К., Алене П., Лідзіі П., Т.П., Наталлі А., Алене Л., В.Ф., Альберту С., Міхаілу Ж., М.Б., В.Ш., С.К., Алене М., Юрыю Л., Ігару С., К.М., Барысу А., М.Б., К.Л., Аляксандру Ц., А.Д., А.В., Ганне Г., Аркадзю М., Маі П., П.Л., В.Л., Л.М., Валянціну В., В.З., А.Х., Уладзіміру Ш., Пятру Б.** з Мінска.

# У БРСМ, «Белую Русь» — заганяюць, з апазіцыйных партый — выганяюць

Шасці настаўнікам з Мінскай вобласці пагражаюць звальненнямі за палітыку.



Алесь Язвінскі з Нясвіжа: Як я дзецям выкладаць буду?



Таіса Данілевіч размаўляла з настаўнікамі такім тонам, што чуваць было ў калідоры.

15 студзеня загадчыца ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Таіса Данілевіч прымала ў сябе настаўнікаў, якія з'яўляюцца сябрамі апазіцыйных палітычных партый.

«Раніцай у пятніцу мяне раптоўна выклікалі да начальніка аддзела адукацыі раёна, — кажа настаўнік фізкультуры з Нясвіжа, сябар КХП-БНФ Алесь Язвінскі. — На службовай машыне павезлі ў Мінск. Нас там было шэсць чалавек. Данілевіч па адным выклікала да сябе ў кабінет. Хаця яна размаўляе такім тонам, што добра было чуваць, што гаварылася астатнім».

Спадар Язвінскі кажа, што яму было прапанавана напісаць заяву аб выхадзе з партыі, у адваротным выпадку пагражалі звальненнем. «Спн.Данілевіч са мной размаўляць нават не хацела, звярталася толькі да начальніка РАА. Яшчэ яе абурыў бел-чырвона-белы значок, што быў у мяне на пінжаку».

Такія самыя ўмовы былі высунутыя настаўніцы гісторыі з Пухавіччыны Наталлі Ільініч, настаўніку ангельскай мовы з Лагойшчыны Міколу Ляшчуну, настаўніку геаграфіі з Нясвіжчыны Уладзіміру Парэйку, настаўніку фізкультуры з Вілейкі Сяргею Клімёнку, настаўніцы-дэфектолагу з Любані Надзеі Агафонавай.

Алесь Язвінскі кажа, што выходзіць з партыі не збіраецца, бо ў ёй ад моманту заснавання. «Як я дзецям выкладаць буду, калі зараз адмоўлюся ад сяброўства ў КХП-БНФ? На ўроках я не вяду прапаганду, але вучу дзяцей патрыятызму», — кажа А.Язвінскі.

А вось Мікола Ляшчун і Надзея Агафонава былі вымушаныя напісаць заявы аб выхадзе з партый БНФ і АГП адпаведна. Наталля Ільініч жа напісала скаргу ў пракуратуру — кантракт з ёй быў падоўжаны 12 студзеня.

Сваімі дзеяннямі ўпраўленне адукацыі парушае канстытуцыйнае права грамадзян быць сябрамі палітычных партый і арганізацый. А галоўнае — які цынізм, абураюцца настаўнікі. У БРСМ, «Белую Русь» заганяюць, яшчэ і грошы дзяруць на падкормку функцыянераў, з астатніх — выганяюць. І гэта называюць «самай дэмакратычнай сістэмай у свеце».

**ЗП**

# Аранжавыя і сінія памяняліся пазіцыямі

Юлія Цімашэнка адстала ад Віктара Януковіча на 10% галасоў.

Вынікі першага тура прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне не прынеслі нечаканасцяў — у тур другі выйшлі лідэр Партыі рэгіёнаў Віктар Януковіч і прэм'ер-міністр Юлія Цімашэнка.

Паводле афіцыйных вынікаў Цэнтральнай выбарчай камісіі, за Януковіча аддалі свае галасы 35,3% (8 мільёнаў 684 тысячы) выбарцаў, за Цімашэнку — 25% (6 мільёнаў 155 тысяч).

Цімашэнка перамагла ў 16 абласцях захаду і цэнтра, а Януковіч толькі ў 11-ці, але густанаселеных рэгіёнах усходу, а таксама ў Закарпацці.

Рэкорд за Януковіча паставіла родная Данецкая вобласць. Там за палітыка аддалі свае галасы 76% выбарцаў. Таксама за Януковіча галасавалі Крым, Днепрапятроўск, Запарожжа, Луганск, Адэса, Харкаў, Херсон.

Цімашэнка ж найбольшы працэнт набрала на Валыні — 53,8%. А вось на роднай Днепрапятроўшчыне яе рэйтынг не такі і высокі. У Львове і Прыкарпацці амаль аднолькава з ёю галасоў атрымаў Віктар Ючшанка.

Трэцяе месца на выбарах заняў банкір і мільянер Сяргей Цігіпка (13%). Менавіта за яго аддавалі свае галасы людзі, якія расчараваліся ва ўладзе, а таксама не хацелі падтрымліваць Цімашэнку і Януковіча.

Чацвёртым стаў Арсень Яцанюк (7%), хоць яшчэ год назад ягоны рэйтынг быў у раёне 15%.

Толькі пятым стаў дзейсны прэзідэнт Віктар Ючшанка (5,5%). Гэта сведчаць пра ўзровень незадаволенасці людзьмі эканамічнай і палітычнай становішчам ва Украіне.

Адным з характэрных момантаў гэтай кампаніі стала меншая ўвага да расійскай тэматыкі. Нават Віктар Януковіч, які на мінулых выбарах спрабаваў разыграць расійскую карту, фактычна не падымаў гэтую тэму.

Прэзідэнцкая кампанія была адзначаная вялікай колькасцю кампраматy на кандыдатаў. Януковіча вінавацілі ў незаконнай прыватызацыі дзяржаўнай рэзідэнцыі, а Цімашэнку — у вывазе грошай праз афшорныя кампаніі. Аднак, ні першая, ні другая справы не дайшлі да суда.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Пра Цімашэнку кажуць, што ў яе пад футрам — атамны рэактар.

Для Беларусі ж асаблівай розніцы ад таго, хто стане наступным прэзідэнтам суседняй дзяржавы, няма. Найхутчэй, што абодва палітыкі працягнуць у дачыненні нашай краіны цяперашнюю палітыку.

Другі тур украінскіх выбараў адбудзецца 7 лютага.

**Зміцер Панкавец**



## СЦІСЛА

### Акцыя салідарнасці прайшла без затрыманняў

Каля 30 чалавек выйшлі 16 студзеня на Кастрычніцкую плошчу. Людзі з партрэтамі палітвязняў стаялі на прыступках Палаца прафсаюзаў. Міліцыя хоць і замінала, але нікога не затрымала.

### Прызначылі псіхіятрычную экспертызу

У панядзелак следчая паведаміла Сяргею Каваленку, што яму прызначаная псіхіятрычная экспертыза, а таксама, што абвінавачванні супраць яго перакваліфікаваныя. Цяпер яго абвінавачваюць не толькі ў хуліганстве, але і ў супраціве работнікам міліцыі. 7 студзеня Каваленка вывесіў бел-чырвона-белы сцяг на найвышэйшую навагоднюю яліну Віцебска.

### Сямашка ў Парыжы

Дэлегацыя ўрада на чале з першым віцэ-прэм'ерам Уладзімірам Сямашкам 19 студзеня распачала насычаны візіт у Францыю.

**ЗП**

# Чорны перадзел

**Стаўбцоўскія раённыя ўлады забіраюць назад участкі, выдзеленыя людзям у пажыццёвае валоданне.**

Пра перадзел зямлі пісаў яшчэ Іван Мележ у сваіх «Людзях на балоце». Гісторыя паўтараецца. Толькі са зменай стагоддзя сталі іншымі дэкарацыі. У дадзеным выпадку замест Куранёў у палескіх балотах дзеянне адбываецца ў пасёлку Школьны Стаўбцоўскага раёна.

Яблыкам разладу ў Хатаўскім сельсавеце, што непадалёк ад Налібоцкай пушчы, стаў штучны вадаём, выкапаны яшчэ пры Польшчы. Пан, уладальнік гэтай зямлі, разводзіў у ім рыбу. Праз 80 гадоў тая ж ідэя прыйшла ў галаву раённаму кіраўніцтву. Назваўшы тую ж справу аграэкатурызмам, можна сустракаць замежных турыстаў і збіраць падаткі. Толькі вось навакольную зямлю ўжо раздалі ў пажыццёвае валоданне. Што рабіць? Забраць участкі!



ТАЦЦЯНА ГАЎРЫЛЬЧЫК

**29-гадоваму вайскоўцу Андрэю Сакольнікаву зямлю спачатку далі, а пасля забралі.**

### Алкагольныя рэкі і бражныя берагі

Да 2004 года гэтая зямля належала Хатаўскому спіртзаводу — філіялу беларускай алкагольнай імперыі «Мінск-Крышталь». Савецкі спосаб гаспадарання пакінуў адбітак на хатаўскай зямлі — напрыклад, у пасёлку Школьны ёсць алкагольны вадаём. Сюды дзесяцігоддзямі злівалі брагу...

Участкі ў наваколлі Школьнага таксама былі ў занядбанні. Калі спіртзавод ад іх адмовіўся, Стаўбцоўскі райвыканкам з радасцю прыняў падарунак — зямлі было аж 45 га! — каб раздаць яго людзям. У рашэнні раённых уладаў аб перадачы зямлі ёсць важныя словы: «Перадаць землі ў склад зямель пасёлка Школьны». Звычайная, здавалася б, фраза, без якой людзі не змаглі б атрымаць участкі. Але менавіта праз яе неўзабаве разгарыцца судовая шура-бура.

Згодна з тагачасным Зямельным кодэксам, ніякіх аўкцыёнаў па продажы ўчасткаў не праводзілася. Ахвотныя атрымаць зямлю мусілі проста напісаць заяву ў сельсавет з адпаведнай просьбай.

### Даюць — бяры

Гэтак і зрабіў 29-гадовы вайсковец Андрэй Сакольнікаў. Ён і двое ягоных сяброў вырашылі збудаваць дамы па суседстве і папрасілі тры ўчасткі побач.

«Лукашэнка ў той час казаў — бярыце зямлю, пакуль даюць, бо потым не можа і не быць. Мы паслухаліся. Знаёмыя рыбакі якраз расказвалі, што тут, каля Хатавы, прыгожыя мясціны, дый рыбы хапае. Вось вырашылі каля ракі і ўладкавацца», — расказвае Андрэй.

Яму дастаўся ўчастак плошчай 0,25 га. Але будоўлю ўсё адкладаў. То адпраўлялі ў паўгадавую камандзіроўку ў іншую вобласць, то ў продажы не было патрэбных будматэрыялаў — якраз тады краіна сутыкнулася з дэфіцытам цэменту. Тым не менш, з дапамогай сваякоў новы гаспадар расчысціў тэрыторыю і заклаў падмурак.

### Акт вымання

За гэты час раённая ўлада змянілася. Новая мятла стала месці па-новаму, а былыя старшыня райвыканкама Радзюк і яго намеснік Камар, пры якіх участкі выдзяляліся, трапілі за краты.

У красавіку 2008 года камісія ў складзе старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама склала акт вымання маёмасці ў Сакольнікава і яго суседзяў. Праз месяц такое ж рашэнне прыняў сельвыканкам. Было прыпынена права Сакольнікава на валоданне зямлёй, права ўласнасці на зямлю і права арэнды.

Аблвыканкам, куды ўласнік звярнуўся са скаргай, назваў дзеянні падначаленых незаконнымі і загадаў адмяніць рашэнне. Але адказам было бяздзеянне мясцовай улады.

Тады Сакольнікаў звярнуўся ў Стаўбцоўскі раённы суд — і выйграў справу. Суд пастанавіў вярнуць участак уласніку. Але гэта быў толькі пачатак доўгага перацягвання каната.

Пасля суда Сакольнікаў яшчэ раз звярнуўся ў сельсавет з просьбай перадаць яму яго 25 сотак у прыватную ўласнасць. Але атрымаў адмову. Яму растлумачылі, што гэту зямлю ўвогуле нельга аддаваць ва ўласнасць праз «парушэнні пры складанні рэгістрацыі». Таксама раптам выявілася, што тэрыторыя ўчастка выкарыстоўваецца тутэйшай школай як стадыён, праўда, недакументаваны. І ўвогуле патрэбны ўчастак не ўваходзіць у склад населенага пункта. Прытым, як адзначана вышэй, у 2004-м выканаўчыя ўлады самі даручалі зрабіць яго часткай пасёлка.

Сакольнікаў звярнуўся ў той самы суд яшчэ раз, са скаргай на тое, што яго ранейшае рашэнне мясцовая ўлада ігнаруе. Але гэтым разам Феміда... схіліла вагі ў процілеглы бок. Цяпер дзеянні сельсавета, які забраў зямлю, былі названыя законнымі.

### Падмурак на дарозе

Варта адзначыць, што яшчэ да часу першага суда з'явіўся іншы чалавек, таксама зацікаўлены ў зямлі. У снежні 2007 года сельсавет выдаў у карыстанне прадпрымальніку Святаславу Бураку, які ўжо арандаваў у ваколіцах два возеры, тую самую панскую сажалку. Тут і выявілася прыкрая недарэчнасць: праезд да вады толькі адзін, і праходзіць праз участак Сакольнікава. Калі ён атрымліваў свой участак, улады і падумаць не маглі, што пасля можна будзе здаць у арэнду і вадаём. Калі ж зразумелі — праезду перашкаджаў падмурак.

Тым не менш, пры спрыянні раённых уладаў Бурак атрымаў льготны крэдыт на развіццё бізнэсу — ён збіраўся займацца аграэкатурызмам. Грошы нельга было атрымаць без згоды спецыяльнай камісіі пры сельсавеце.

Інтарэсы бакоў сутыкнуліся ў простым значэнні слова, калі Бурак павёў бульдозер да свайго вадаёма проста па фундаменце суседняга дома. Сакольнікаў зуважыў пашкоджанні не адразу, бо зімой наведваўся на ўчастак рэдка. Калі ж звярнуўся ў міліцыю, тая ўгледзела ў дзеяннях прадпрымальніка адміністрацыйнае парушэнне, але развяла рукамі — мауляў, тэрмін адказнасці сышоў.

Наступная сустрэча Сакольнікава з Бураком аказалася выпадковай — кожны зайшоў у суд па сваіх справах. «Выявілася, што прыстаўы спрабуюць выціснуць з Бурака праз суд аліменты. А выцягваць фактычна няма чаго, бо заробку ў яго няма. І пры гэтым ён здолеў — дзіва дзіўнае! — выплаціць крэдыт датэрмінова», — паціскае плячыма Андрэй Сакольнікаў.

Крэдыт насамрэч быў пагашаны амаль адразу. Як расказала сястра Святаслава Бурака, стаўкі аказаліся вельмі высокімі — дзеля гэтага прадпрымальніку прыйшлося прадаць уласны дом.

Сам бізнэсмен прэтэнзій да суседзяў не мае: «Калі ўлада дазволіць, хай будуюцца. Мне нават лепш, што нехта побач будзе жыць, а не бязлюддзе будзе. А дарогу можна і праз лес пракласці».

### Суд за «дыпламаванага барана»

Сакольнікаў не думае здавацца. Ён перакананы, што зямля належыць яму па законе. З двух сяброў Андрэя, разам з якімі ён атрымліваў зямлю, адзін прыслухаўся да настойлівых просьбаў «зверху» і адмовіўся ад свайго ўчастка. Другі ж паспеў пабудаваць і дом, і лазню. Праўда, яму прыйшлося прайсці праз сустрэчу з «чырвоным пеўнем» — нехта падпаліў лазню, добра, што паспелі затушыць агонь.

Былі і іншыя эксцэсы. Мясцовыя ўлады адмаўляліся назваць Сакольнікаву разліковы рахунак, каб той не змог пералічыць грошы за арэнду зямлі і атрымаў на сваю галаву яшчэ праблемы з падатковай інспекцыяй.

Андрэй Сакольнікаў, абураны юрыдычна непісьменнымі, на яго думку, дакументамі мясцовых уладаў, напісаў з'едлівую заяву на імя старшыні мінскага аблвыканкама Леаніда Крупца. Ён прапанаваў «для павышэння ўзроўню адукацыі і кваліфікацыі падначаленых арганізаваць курсы вывучэння байкі К.Крапівы «Дыпламаваны баран» з прыняццем у іх заліку». Пакрыўджанае кіраўніцтва стаўбцоўскага райвыканкама вырашыла адстойваць свае гонар і годнасць у судзе. У пазове чыноўнікі пералічвалі ўсе свае дыпломы і патрабавалі з крыўдзіцеля прабачэнняў і пісьмовага абвяржэння. Суд той меў адбыцца 19 студзеня, яго перанеслі.

...У «Людзях на балоце» перадзел скончваецца самасудам Васіля і часовым захопам ім зямлі. Ці дойдзе да гэтага ў пасёлку Школьны? Пытанне застаецца адкрытым.

Улады ж хочуць пакуль увогуле не кранаць зямлю — пакуль яна знаходзіцца за межамі пасёлка, прэтэндаваць на яе ніхто не зможа.

**Ягор Марціновіч**

## МВФ «не супраць невялікай карэкцыі» курса рубля

Гэта можа азначаць згоду на новую дэвальвацыю.

У Беларусі адсутнічае неабходнасць у значнай карэкціроўцы валютных курсаў, хоць невялікая карэкцыя можа быць абгрунтаваная. Пра гэта гаворыцца ў дакладзе Міжнароднага валютнага фонду (МВФ). Аналітыкі прыйшлі да заключэння, што незбалансаванасць у валютнай палітыцы Беларусі ўрэгуляваная. Ці неабходная далейшая карэкціроўка курсаў — залежыць ад мер, што праводзяцца беларускімі ўладамі.

**СМ**

## СЦІСЛА

### Заробак знізіўся на 0,3%

У студзені—лістападзе 2009 г. намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата работнікаў склала 989,8 тыс. рублёў. Рэальны заробак за названы перыяд у параўнанні са студзенем—лістападам 2008 года знізіўся на 0,3% пры прагнозе росту на 2009 год на 17%.

### Электрычнасць падвісла разам з нафтай

Пытанні паставак у Беларусь расійскай электраэнергіі і яе транзіту ў Калінінградскую вобласць і краіны Балтыі мелі абмяркоўвацца 19 студзеня ў Мінску прадстаўнікамі канцэрна «Белэнерга» і расійскай кампаніі «Інтэр РАО ЕЭС». Аднак у апошні момант Мінэнэргетыкі паведаміла, што сустрэча адкладзена «з арганізацыйна-тэхнічных прычын».

### «Абсалютбанк» прадае абменнікі

ЗАТ «Абсалютбанк» выставіла на рэалізацыю па рэштквым коштe некалькі пунктаў абмену валют у Мінску. Нагадаем, у снежні два абменныя пункты гэтага банка былі абрабаваныя. Прычым ёсць меркаванне, што прынамсі адзін з іх пачысціў работнік самога ж банка.

**СГ, БелаПАН**

# У энергетычнай пятлі

«Братэрская інтэграцыя» без скандалаў не можа. Цяперашняя нафтавая спрэчка лішні раз гэта пацвердзіла. Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Лукашэнкавы крытыкі ўжо мільён разоў казалі: не было чаго лезці ў пятлю саюзнай дзяржавы, даўно б жылі як людзі. Але скептыкі тут жа зразаюць: ну і далёка адышлі вашы прыбалты, напрыклад? Таксама ж у яме.

Пардон, але яма яме не роўная.

У 1989 годзе мы былі амаль удвая багацейшыя за літоўцаў, калі браць ВУП на душу насельніцтва паводле парытэту пакупной здольнасці: 6 667 долараў супраць 3 603. А вось у 2007-м прапорцыя выглядала ўжо як 10 841 супраць 17 575 не на карысць Беларусі.

Амаль у паўтара разу ($15 987) абагналі нас у гэтым плане і палякі, якія калісьці, памятаеце, скуплялі ў Беларусі ўсё запар, бо ў іх наогул быў голы васэр.

У Латвію, якую крызіс дзеўбануў асабліва балюча, цяпер укідаюць велізарныя грошы Еўрасаюз ды МВФ. «Санацыя эканомікі там ідзе праз Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця, скандынаўскія банкі. Гэта ўжо і іх праблемы», — адзначае эканаміст Яраслаў Раманчук. Іначай кажучы, краіны Балтыі паспелі ўбудавацца ў Еўропу дастаткова для таго, каб не згінуць па адной. У вялікай кампаніі зусёды знойдзецца ратавальны план Б.

А вось аўтаркія гордай сінявокай рэспублікі вядзе да таго, што Расія метадычна намагаецца прыперці да сценкі.

Пасткі былі расстаўленыя яшчэ на мяжы 2006—2007 гадоў. Тады пасля нервовага высвятлення адносінаў Масква навязала Мінску два пагадненні — па газу і нафце.

Нафтавае пагадненне, разлічанае на тры гады, было варыянтам плаўнага закрыцця беларускага афшору: Масква распланавала паступовае скарачэнне мытнай зніжкі на чорнае золата. Цяпер прыйшоў час разлічвацца па поўнай праграме, але Мінск усё яшчэ не верыць, што банкет скончаны.

Аднак тая акалічнасць, што разбіраецца з братэрскай Беларуссю ў нафтавым пытанні даручана віцэ-прэм'еру Сечыну, старому паплечніку Пуціна і па жыццi суроваму чалавеку, лішні раз паказвае: жарты прэч, беларускую нафтанку ўжо «замовілі»!

Газавае пагадненне, заключанае з Мілерам «пад елачкай» за дзве хвіліны да наступлення 2007 года, — таксама не што іншае, як паэтапнае ўразанне гранта. Прадугледжаны паступовы выхад на еўрапейскія цэны да 2011 года.

Так, перыядычна робяцца нейкія палітычныя зніжкі, але сутнасці справы гэта не мяняе. Развязка і ў газавым пытанні непазбежная. Праз год у беларускага начальства будуць, мабыць, такія ж круглыя вочы: няўжо поза страуса зноў не спрацавала?

Як бачым, Расія метадычна рэалізуе свой план — дэталёва распісаную да 2011 года стратэгію эканамічнага націску на Беларусь. А тутэйшае начальства ўсё грувасціць саўковыя пяцігодкі росту ВУП ды спадзяецца на ўдачу.

Чарговай авантурай стала ўваходжанне ў мутны Мытны саюз. Цяпер аказалася, што надзеі на танныя энергарэсурсы пад новай шыльдай не пракочваюць.

Краіна апынулася ў энергетычнай пятлі. І будаўніцтва АЭС пры дапамозе Расіі можа толькі тужэй зацягнуць гэтую пятлю. Усе ж іранска-венесуэльскія альтэрнатывы пакуль што несур'ёзныя. А па балтачарнаморскай восі сапраўдную энергетычную гульню Мінск, лічы, і не пачынаў.

Па вялікім рахунку, вось ужо 15 гадоў краіна так і боўтаецца без плана Б, разлічваючы толькі на шанцаванне. Дакладней, план Б палягае ў тым, каб у выпадку чаго ўчыніць скандал («Я патрабую працягу банкету!») і тое-сёе ўсё ж выдзерці. Але гэта слабы план.

На прэс-канферэнцыі 30 снежня, разважаючы над урокамі 2009 года, Лукашэнка прызнаў: «Мадэрнізавацца трэба было хутчэй».

Ну, хай бы сабе такую рэпліку кідала адсунутая ў далёкі кут ад вагароў улады апазіцыя. А хто перашкаджаў хутчэй гэта рабіць высокаму начальству ў цалкам кіраванай, як з гонарам зазначаецца, краіне? Тут ужо ўсе магчымыя і немагчымыя паўнамоцтвы ў адных руках сабраныя.

Можа, якраз у гэтым і загвоздка?

# Год таму Зімоўскі абяцаў Трусаву беларусізаваць БТ. І што?

Алег Трусаў: Вынік года — рэгіянальныя навіны па-беларуску.

Мінуў год пасля сустрэчы старшыні Таварыства беларускай мовы Алега Трусава і кіраўніка Нацыянальнай дзяржтэлерадыёкампаніі Аляксандра Зімоўскага. Яна адбылася 27 студзеня 2009 года з ініцыятывы старшыні ТБМ. Тады А.Трусаў агучыў сем прапаноў кіраўніцтву НДТРК па выпраўленні моўнай палітыкі дзяржаўнага тэлебачання.

Нагадаем, А.Зімоўскі пагадзіўся з пяцю пунктамі: заснаваць на адным з дзяржаўных тэлеканалаў перадачу «Гаворым па-беларуску»; стварыць цыкл беларускамоўных перадач на гістарычную тэматыку; зрабіць перадачу, прысвечаную 10-й гадавіне Міжнароднага дня роднай мовы; раз на месяц ладзіць на тэлебачанні тэматычныя круглыя сталы па пытаннях беларускай мовы і культуры з удзелам незалежных грамадскіх арганізацый; аднавіць дубляж замежных фільмаў на беларускую мову.

Дзве прапановы ТБМ (зрабіць Першы нацыянальны канал цалкам беларускамоўным і рабіць зніжку за рэкламу па-беларуску) не знайшлі водгуку. А.Зімоўскі адзначыў, што пытанні патрабуюць «асобнага дэтальнага разгляду».

Што ж з абяцанага было зроблена за год? А.Трусаў так каментуе вынікі: «Створана на АНТ перадача «Гаворым па-беларуску», і мы вельмі гэтым задаволеныя. Зараз ідуць перамовы па з'яўленні аналагічнай на Першым канале. Што датычыць цыкла беларускамоўных перадач на гістарычную і культурніцкую тэматыку, у нейкай ступені гэта рэалізавана на АНТ. Там існуе перадача пра гісторыю беларускіх слоў. Былі перадачы, прысвечаныя Дню роднай мовы».

На думку А.Трусава, павісла ў паветры абяцанне раз на месяц ладзіць на тэлебачанні абмеркаванне праблем нацыянальнай мовы і культуры. «Было токшоу «Выбар», прысвечанае стаўленню да мовы і культуры. Але пасля таго, як дзесяць тысяч гледачоў выказалася ў падтрымку нацыянальных каштоўнасцяў, на тэлебачанні спалохаліся», — кажа А.Трусаў.

Колькасць мастацкіх фільмаў, дубляваных на беларускую мову, не павялічылася, кажа А.Трусаў. Дадамо: быў нуль і застаўся нуль.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Затое пры канцы 2009-га Белтэлерадыёкампанія перавяла на беларускую мову рэгіянальныя навіны, адзначае А.Трусаў. Гэта, напэўна, і было самым важным крокам да беларусізацыі БТ. Караценькая перадача «Гаворым па-беларуску» з экзатычным вядучым шмат для каго застанецца незаўважнай цікавосткай, а штодзённыя беларускамоўныя навіны з іх высокім глядацкім рэйтынгам будуць мець больш эфект.

**Алесь Пілецкі**



## Зянон Пазняк: Каваленка стаў рыцарам

Зянон Пазняк пракаментаваў учынак актывіста КХП-БНФ Сяргея Каваленкі, які вывесіў на яліне ў Віцебску бел-чырвона-белы сцяг.

«Легендарны Мірон (а гэта канкрэтны чалавек) сваімі подзвігамі стварыў нефармальны «Ордэн беларускага сцяга». Рыцарам Сцяга можна стаць, толькі здзейсніўшы подзвіг, варты ўзроўню Мірона. Сяргей Каваленка стаў такім рыцарам. ...

І заўважце, Каваленку выпусцілі да суда, бо спалохаліся ... росту яго папулярнасці. ...

Хоць павольна, але мінае ўжо час цемры».

## «Людзі кажуць, што гэта міліцыя, але ў доме размешчана МУС»

Міністэрства ўнутраных спраў абвесціла конкурс на найлепшы тэкст для гімна МУС. Газета «Міліцэйскі веснік» прапанавала на суд чытачоў тры варыянты, адзін з якіх — па-беларуску.

Газета прапануе сваім чытачам далучацца, свае тэксты можна дасылаць на адрас рэдакцыі: 220036, г. Мінск, вул. К. Лібкнехта, 57, з пазнакай «Выбар Гімна МУС».

Цяперашні беларускамоўны варыянт гучыць камічна:

Ёсць будынак у цэнтры сталіцы,
Бачыў кожны яго беларус.
Людзі кажуць, што гэта міліцыя,
Але ў доме размешчана МУС.

Прыпеў:
Па краіне ўсёй да раёна
Дзень і ноч супрацоўнікі МУС
Заступаюць на варту Закона,
Адхіляюць людзей ад спакус.

І гэтак далей.

Мо хтосьці з чытачоў «НН» прапануе лепшы варыянт? Думаем, ганарары ў міліцыі шчодрыя.

**Сямён Печанко**

# Забаранілі пасыпаць дарогі соллю

З сярэдзіны студзеня ўсе камунальныя службы павінны адмовіцца ад солі з пяском.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Гэтага патрабуе новая пастанова Міністэрства аховы здароўя. Адзін з аўтараў новых патрабаванняў, лекар-гігіеніст Павел Сідаровіч, паведаміў, што пры распрацоўцы дакумента спецыялісты карысталіся расійскім досведам. У Маскве са слізгатой змагаюцца з дапамогай хларыдна-фасфатнага дадатку.

«Соль раз'ядае не толькі абутак, але і аўтапакрышкі ды забруджвае зямлю. А што азначае засаленне глебы? Гэта і зялёнае пакрыва пачынае цярпець з цягам часу». Ён дадае: «Чалавеку соль псуе абутак, праядае падэшвы. Вільгаць паступае ў абутак, чалавек прастуджваецца больш — і што, гэта нармальна?»

**Валера Руселік, «Еўрарадыё»**

## Камандзір палка ППСМ незаконна налічваў прэміі, але не краў

Гомельскі абласны суд адмяніў прысуд былым камандзірам палка патрульна-паставой службы УУС Гомельскага аблвыканкама. Аблсуд накіраваў справу на перагляд.

Камандзіраў вінавацілі ў крадзяжы і перавышэнні ўлады. Яны налічвалі падначаленым прэміі і забіралі іх сабе. Афіцэры сцвярджалі, што прэміі ішлі на патрэбы палка: на куплю шклопакетаў, кандыцыянераў, жалюзі, падарункаў дзецям супрацоўнікаў на Новы год, арганізацыю «салодкіх сталоў» і банкетаў.

Суд прыйшоў да высновы, што кіраўнікі палка вінаватыя ў незаконным налічэнні прэмій (г.зн. перавысілі ўладу), але не вінаватыя ў крадзяжах (г.зн. у тым, што гэтыя грошы былі прысвоеныя).

Такім чынам, былыя міліцыянеры былі прызнаныя вінаватымі па ч. 2 арт. 426 і апраўданыя па ч. 3 арт. 210.

**Алена Германовіч, БелаПАН**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**19 студзеня, на Вадохрышча, традыцыйна ныралі ў палонку і байцы брыгады 3214 Унутраных войскаў. Да працэдуры далучылася і жаночая частка калектыву.**

### ЗДАРЭННІ

#### Затрыманы наркаман

У Мінску затрыманы 30-гадовы раней неаднаразова судзімы жыхар сталіцы. Ён падазраецца ва ўчыненні 30 крадзяжоў з аўтамабіляў. Разбіваючы шкло, злодзей выкрадаў аўтаманітолы, GPRS-навігатары, мадулятары. З машын здымаў каўпакі, молдынгі, дэкаратыўныя значкі. Асноўная частка грошай ішла на наркотыкі.

#### Злавілі трох прастытутаў

Да адміністрацыйнай адказнасці да прастытуцыю ў Мінскай вобласці ў 2009 годзе былі прыцягнутыя тры мужчыны: студэнт і два рабочыя. Свае паслугі яны прапаноўвалі жанчынам праз інтэрнэт. Адзін, будаўнік, пазіцыянаваў сябе як пастаўшчыка паслуг для VIP кліентаў. Дык заявіўся на званок міліцыянткі проста ў будаўнічым спецадзенні. Другі рабіў зніжку, калі жанчына прыходзіла на сустрэчу з сяброўкай.

#### Напаў з сякерай на пенсіянерку

У дом 72-гадовай мінчанкі праз акно пранік мужчына і, пагражаючы сякерай, завалодаў дзвюма тысячамі рублёў і банкаўскай карткай.

**СМ**

## У Польшчы створаць супервойска

Прыдатнасць салдатаў будзе вызначацца па выніках генетычных даследаванняў.

Адборам у войска польскае зоймуцца генетыкі. Распрацаваны механізм сканавання генетычнага кода кожнага польскага жаўнера. На падставе аналізу гэтага кода будуць вызначацца псіхічныя і фізічныя рысы салдата, схільнасць да пэўных хвароб.

Маючы такія веды, можна будзе не толькі хутка аказаць медычную дапамогу параненаму, але і рабіць правільны адбор у розныя падраздзяленні. Падобныя тэхналогіі распрацоўваюцца ў ЗША, Вялікабрытаніі і Германіі.

Даследаванні генетычных кодаў жаўнераў пачаліся ў 2007 годзе і павінны былі скончыцца сёлета. Аднак пакуль удалося вывучыць толькі шэсць з запланаваных дваццаці тысяч кодаў.

**Алесь Пілецкі**

## Rammstein прыедзе пад Дзень жанчынаў

Канцэрт у рамках сусветнага турнэ адбудзецца 7 сакавіка ў «Мінск–Арэне».

Сусветнавядомы нямецкі гурт Rammstein пацвердзіў, што зайграе ў Беларусі. Гурт прывязе да нас свой новы альбом «Liebe ist fur alle da». У «Мінск-Арэне» немцы хочуць сабраць 15 тысяч гледачоў.

Перад гэтым пры канцы лютага гурт заспявае ў Санкт-Пецярбургу і Маскве, 4 сакавіка — у Рызе, 5 сакавіка — у Вільні, 9 сакавіка — у Кіеве.

Гурт Rammstein яднае традыцыі індастрыял-металу і нямецкай цяжкай музыкі. Амаль усе песні выконваюцца па-нямецку. Каманда праславілася сцэнічнымі шоу і эпатажнымі тэкстамі. Часам іх вінавацяць у неанацызме і блюзнерстве.

**Сямён Печанко**




**Продаж апошняга альбома Rammstein непаўналетнім забаронены. У Нямеччыне забароненая і публічная дэманстрацыя гэтай вокладкі. А вось у Беларусі альбом прадаецца адкрыта.**

### СЦІСЛА

#### Украінцы аспрэчваюць у беларусаў надпісы на ўказальніках

Польскі «Закон аб нацыянальных меншасцях» дазваляе ў мясцовасцях, дзе не менш за 20% грамадзян складаюць прадстаўнікі меншасці, выкарыстоўваць у якасці дапаможнай мову мясцовага насельніцтва. Дазволена афармляць указальнікі населеных пунктаў на мове меншасці.

Цяпер гэта выклікала палеміку ў гміне Орля на Падляшшы, дзе жывуць этнічныя беларусы. Дэпутаты гэтай гміны вырашылі, што назвы 26 вёсак павінны быць прадубляваны на ўказальніках па-беларуску. Аднак рашэнне выклікала нечаканы супраціў у мясцовых украінскіх актывістаў. На іх думку, жыхары гміны размаўляюць не на беларускай мове, а на дыялекце ўкраінскай.

**«Еўрарадыё»; СП**

### КРЫМІНАЛ

#### З нажом на калядоўшчыка

У Мазыры ў пад'ездзе невядомы, пагражаючы нажом забраў у 11-гадовага хлапца пакет з цукеркамі і 38 тысяч рублёў. Злачынства ўчыніў непрацуючы мясцовы жыхар 1993 года нараджэння, раней ужо судзімы за крадзеж.

#### Бізнэсовец узяў закладнікаў

З гаража 27-гадовага бізнэсоўца з Мінска скралі тры матацыклы. Калі таварыш пацярпелага знайшоў аб'яву аб продажы байка, падобнага па прыкметах на адзін са зніклых, яны з гаспадаром схапілі прадаўца і паўдня трымалі ў закладніках. Калі сапраўдны злодзей выйшаў на кантакт, хлопцы замянілі на яго рэалізатара тэхнікі. Ад злодзея запатрабавалі $11 000 у якасці «маральнай кампенсацыі». У дачыненні да бізнэсоўца і яго кампаніі пачатая крымінальная справа за выкраданне чалавека, вымагальніцтва. Ім пагражае ад 5 да 12 гадоў турмы. Злодзею ж за матацыклы —да 4 гадоў.

#### 44-гадовы падазраецца ў забойстве 101-гадовай

Раней неаднаразова судзімы 44-гадовы жыхар Веткаўскага раёна затрыманы па падазрэнні ў забойстве жыхаркі Жыткавіцкага раёна 1908 года нараджэння. Труп пенсіянеркі быў знойдзены ў яе доме ў вёсцы Хлупін. Выкрадзены грошы і рэчы.

**СМ; БелаПАН, guvd.gov.by**

# Яўген Афнагель і Павел Юхневіч:
# Людзі ў нас сапраўды вераць

Толькі Беларусь без дыктатуры можа быць часткай Еўрасаюза, мяркуюць хлопцы з «Еўрапейскай Беларусі».

Хлопцы з «Еўрапейскай Беларусі» заўсёды наперадзе астатніх на вулічных акцыях. Яны часта з сінімі павязкамі і сцягамі Еўрасаюза. Самыя арганізаваныя і мабільныя. На традыцыйных днях салідарнасці яны першымі пачынаюць акцыю і першымі сканчаюць. На іх раўняюцца астатнія.

Частка гэтых хлопцаў прайшла праз школу «Зубра», які абвясціў пра самароспуск вясной 2006 года.

Дзіўным чынам «Еўрапейская Беларусь» не ўступае ні ў якія моладзевыя кааліцыі, але ўмудраецца захоўваць добрыя стасункі з іншымі арганізацыямі.

Пра наяўнасць «Еўрапейскай Беларусі» ў гарадах сведчаць паўсюдныя сінія стужкі, а таксама палітычныя графіці.

Гутарка ў рэдакцыі «НН» з каардынатарамі кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Яўгенам Афнагелем і Паўлам Юхневічам.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Яўген Афнагель (на фота першы злева)**

нарадзіўся ў 1979 у Мінску. Скончыў гістфак педагагічнага ўніверсітэта імя Танка (2001). У нацыянальным руху з 1996. Быў сябрам «Маладога фронту» (1996—2001). У 2001 быў заснавальнікам «Зубра». Жанаты.

**Павел Юхневіч (на фота другі злева)**

нарадзіўся ў 1984 у Мінску. У нацыянальным руху ад 1999. Быў сябрам «МФ» (1999—2001). Заснавальнік «Зубра». Цяпер студэнт ЕГУ. Жанаты.

## Заснаваная ў 2008-м

**«Наша Ніва»: Як узнікла «Еўрапейская Беларусь»?**

**Яўген Афнагель:** Кампанія пачалася, бо апазіцыя павінна мець ясную альтэрнатыву палітыцы Лукашэнкі, цалкам скіраванай на Расію. Гэтай альтэрнатывай можа быць толькі Еўрапейскі Саюз. Для нас гэта адзіны спосаб абароны незалежнасці краіны. Беларусь павінна стаць часткай ЕС, часткай еўрапейскай цывілізацыі. Для таго патрэбная праца, таму і пачалі нашу кампанію.

**«НН»: Чаму кампанію? Не арганізацыю, не партыю?**

**ЯА:** Арганізацыя ці партыя — гэта жорсткая структура, іерархія, лідэр, намеснікі, афіцыйная рэгістрацыя. Для ўдзелу ў кампаніі не трэба запаўняць ніякія паперы. Прыйдзі да нас, вазьмі налепак ды паклей. Або выйдзі на акцыю.

## Калі лібералізацыя, то дазвольце найперш нацыянальны сцяг

**«НН»: А колькі чалавек налічвае «Еўрапейская Беларусь»? Вось «МФ» кажа пра тысячу прыхільнікаў.**

**ЯА:** Я не магу сказаць, што шмат, бо шмат у апазіцыі ні ў кага няма. Патэнцыйных нашых прыхільнікаў многа. Але канкрэтныя лічбы нашых актывістаў называць не хочацца.

**«НН»: Вулічныя акцыі з'яўляюцца прыярытэтам дзейнасці «Еўрапейскай Беларусі»?**

**Павел Юхневіч:** У той інфармацыйнай сітуацыі, якую мы маем, гэта галоўны інструмент, каб даносіць інфармацыю да людзей.

**«НН»: Чаго яшчэ дабіваецеся, апроч уступлення краіны ў ЕС?**

**ПЮ:** Праводзім кампанію па легалізацыі нацыянальнай сімволікі. Калі ўлада кажа пра лібералізацыю, то яна павінна пачацца з дазволу беспакарана выкарыстоўваць нацыянальныя сцяг і герб.

**ЯА:** Фармаванне дыктатуры ў 1995 годзе пачыналася з забароны бел-чырвона-белага сцяга і герба «Пагоня». Таксама мы вымушаны актыўна змагацца за вызваленне палітвязняў. Пакуль у краіне застаюцца палітычныя зняволеныя, патрабаванне іхняй свабоды і змаганне супраць рэпрэсій будзе адной з галоўных мэтаў дзейнасці.

**ПЮ:** Калі ў нас не будзе палітычных зняволеных, то гэта ўжо будзе троху іншая краіна, нават пры цяперашняй уладзе.

## Апазіцыя пасталела

**«НН»: Ціск на сяброў кампаніі апошнім часам зменшыўся?**

**ЯА:** Хутчэй змяніліся формы. Па-ранейшаму людзей затрымліваюць падчас вулічных акцый. Улады радзей саджаюць людзей на суткі, але замест гэтага іх збіваюць, сочаць, ціснуць, спрабуюць вербаваць. Даходзіць да таго, што пасля сустрэч у кавярнях туды заходзяць людзі ў цывільным і задаюць персаналу пытанні пра нас. Рэпрэсіі не зніклі. Адбываюцца страшныя рэчы, калі актывістаў невядома хто вывозіць за горад. Такое было са мной, з Уладзімірам Лемешам, з сябрамі іншых арганізацый. Таксама даюць нашмат большыя штрафы, чым раней.

**ПЮ:** Жорсткасць, пра якую казаў Яўген, я пабачыў на восеньскіх акцыях на Кастрычніцкай плошчы. У мяне вялікі досвед удзелу ў вулічных акцыях, але такой невытлумачальнай жорсткасці з боку міліцыі я яшчэ не бачыў. Біць сталі менш, але больш балюча.

Людзі, якія былі ў «Зубры», гэта паказчык якасці

**«НН»: А саміх вас колькі разоў затрымлівалі?**

**ЯА і ПЮ** (адначасова)**:** Ужо збіліся з ліку.

**«НН»: Маладых, што прыходзяць у арганізацыю, папярэджваеце пра магчымыя наступствы?**

**ЯА:** Звычайна адразу чалавеку па максімуме кажам, што з ім можа быць. Людзі, якія застаюцца ў апазіцыі, сапраўды вераць, што могуць нешта змяніць у краіне. Цяпер людзі застаюцца ў арганізацыях не каб насіць значок, а каб нешта рабіць. Прычым, часта для сябе небяспечнае.

**ПЮ:** Я хацеў бы яшчэ заўважыць, што апошнім часам значна вырас сярэдні ўзрост людзей, якія прыходзяць у апазіцыю, у моладзевы супраціў. Пяць гадоў назад гэта былі 15-16-гадовыя, цяпер — 18-22-гадовыя.

**«НН»: З чым гэта звязана?**

**ЯА:** Раней апазіцыя была нечым рамантычным. Моладзі ішла, бо гэта была даніна модзе. Я памятаю сябе ў 18 гадоў, калі я з гонарам насіў значак. Цяпер чалавек прыходзіць у апазіцыю пасля доўгіх разваг, ці варта яму туды ісці, рызыкаваць, пазбавіцца працы, вучобы, трапіць на суткі. А за гэта атрымаць толькі нейкую маральную выгаду. А тыя людзі, што прыходзяць, ім не трэба нешта тлумачыць. Яны самі ўсё ведаюць і разумеюць.

**«НН»: А хто лідэры «Еўрапейскай Беларусі»?**

**ЯА:** Зразумела, што лідэры ёсць. Мне давядзецца называць чалавек 30 маіх знаёмых. Без кожнага з іх не было б таго, што маем зараз. Не магу некага канкрэтнага выдзеліць. Баюся некага забыцца, пакрыўдзіць. З гэтымі людзьмі мы прайшлі праз вялікія выпрабаванні, і на іх сапраўды трымаецца «Еўрапейская Беларусь».

## Лукашэнка не гарант

**«НН»: А якое галоўнае адрозненне «Еўрапейскай Беларусі» ад іншых моладзевых ініцыятываў?**

**ЯА:** Мы не зусім моладзевае ўтварэнне. У нас ёсць дарослыя палітыкі, у нас няма ўзроставага цэнзу. Па-другое, не ў крыўду будзе сказана іншым, мы прапаноўваем ясную еўрапейскую альтэрнатыву.

**«НН»: Але ёсць, напрыклад, Рух «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча, які выступае таксама за еўрапейскі шлях для Беларусі. Нават «Еўрапейскі форум» правёў. Дык у вас з ім рознае разуменне еўрапейскасці?**

**ЯА:** Асабіста для мяне мэта «Еўрапейскага форуму» была няяснай. На жаль, некаторыя арганізацыі блытаюць ідэю захавання незалежнасці, еўрапейскага выбару з фактычнай падтрымкай дыктатуры. Толькі Беларусь без дыктатуры можа быць часткай Еўрасаюза. Лукашэнка не можа быць гарантам нашай незалежнасці, як часам можна пачуць. Нават ускосна падтрымліваючы дыктатуру, нельга змагацца за свабоду і незалежнасць.

**«НН»: Вы ні з кім не ствараеце хаўрусы. Але пры гэтым удаецца захоўваць з усімі добрыя стасункі.**

**ПЮ:** Мы супрацоўнічаем з любымі здаровымі сіламі. А моладзь паміж сабой цудоўна разумеецца. У нас выдатныя стасункі з «Моладдзю БНФ», «Маладым фронтам», «Маладой Беларуссю». Той жа паказнік Плошчы, калі выходзяць прадстаўнікі розных арганізацый. Ёсць такія рэчы, якія нас трымаюць разам і яднаюць.

**ЯА:** Кааліцыі на паперках мала што значаць. Сапраўдныя кааліцыі выяўляюцца на Плошчы.

## Грамадства чакае лідэра

**«НН»: У мясцовых выбарах будзеце ўдзельнічаць?**

**ЯА:** Ёсць розныя меркаванні. У выбарах сёння можна ўдзельнічаць толькі тады, калі яны спрыяюць перамозе над дыктатурай. Дзеля птушачкі — бессэнсоўна. Гуляць у гульні з дыктатарам мы не будзем.

**ПЮ:** Гэта як на парламенцкіх выбарах-2008. Нібыта тыя, хто ўдзельнічаў у іх, чакалі іншага.

**«НН»: А бачны нейкі лідэр, які здольны павесці за сабой людзей?**

**ПЮ:** Грамадства чакае з'яўлення чалавека, які скажа: «Я — супраць, пойдзем за мной». І за такім чалавекам сапраўды пойдуць.

**ЯА:** Я ведаю людзей, здольных перамагчы, але гаварыць пра тое рана.

**«НН»: Можна казаць, што «Еўрапейская Беларусь» з'яўляецца працягам «Зубра»?**

**ЯА:** Не. Ёсць людзі, якія былі ў «Зубры». Асабіста для мяне гэта самы лёсавызначальны этап майго жыцця. Прысяга сябра руху «Зубр» прымаецца на ўсё жыццё. Я лічу сябе «зубром».

**ПЮ:** Для мяне людзі, якія былі ў «Зубры» — гэта паказчык якасці. Гэта стан душы. Класна, што ў «Еўрапейскай Беларусі» шмат людзей, якія раней былі ў «Зубры». Але гэта не адно і тое ж.

**«НН»: Часта чуюцца нараканні, што вы выходзіце на акцыі не з бел-чырвона-белымі, а са сцягамі ЕС.**

**ЯА:** Хай пакажуць хоць адну акцыю, дзе мы былі без бел-чырвона-белых сцягоў. Мы вывесілі над праспектам сто нашых палотнішчаў, калі нехта зробіць нешта падобнае, то няхай і наракае.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

# Па машыны ў Літву

**Паездка па аўтамабіль у суседнюю краіну дазволіць ашчадзіць каля тысячы еўра.**

З 1 ліпеня 2010 года мыты на ўвоз аўто фізічнымі асобамі вырастуць да ўзроўню расійскіх. Пра гэта паведаміў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Аляксандр Шпілеўскі. Для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў мыты былі павялічаныя яшчэ ў пачатку года.

Нягледзячы на чаканні, ніякай палёгкі насельніцтву не было зроблена. Гэта значыць, што на пакупку недарагога патрыманага аўто засталося менш за паўгода.

Дзе купляць, што купляць і як купляць?



## Розніца ў цэнах паміж аўтамабілямі ў Беларусі і Літве



| Аўтамабіль | Апісанне аўтамабіля | Цана ў Беларусі (€) | Цана ў Літве + размытнёўка (€) | Аўтамабіль |
|---|---|---|---|---|
|  | Ford Fiesta (2001), дызель, 1800 см$^3$, хэтчбэк | 3040 | 1445+720= 2165 |  |
| | Ford Focus (2001), дызель, 1800 см$^3$, універсал | 4055 | 2750+720= 3470 | |
|  | BMW 318 (2002), бензін, 1900 см$^3$, хэтчбэк | 8390 | 3950+760= 4710 |  |
| | Ford Mondeo (2002), бензін, 1800 см$^3$, хэтчбэк | 4055 | 1850+720= 3470 | |
|  | Volkswagen Passat (2002), бензін, 1800 см$^3$, седан | 5000 | 4050+720= 4770 |  |
| | Opel Astra G (2001), дызель, 1700 см$^3$, хэтчбэк | 4020 | 2400+680= 3080 | |

## Аўтамабільная Мекка

Літву калісьці лічылі аўтамабільным раем для беларусаў і расіян. За апошнія гады выбар зменшыўся, але ўсё роўна краіна застаецца асноўнай пляцоўкай для пакупкі машын.

Асноўныя аўтарынкі Літвы працуюць у Марыямпалі, Каўнасе, Клайпедзе і ў Гарунах пад Вільняй. Большасць з іх маюць вызначаныя працоўныя дні, калі прыязджае найбольш аўтавозаў.

Недасведчанаму аўтааматару выпраўляцца на тыя рынкі аднаму — моцна рызыкаваць. Пытанне не ў асабістай бяспецы. Рэч у тым, што абраць аўто без дэфектаў складана. Умовы продажу тут далёка не еўрапейскія. Выбіраючы машыну з аўтавоза, можна арыентавацца толькі на яе выгляд. Пасядзець у салоне, завесці матор, паперастаўляць перадачы — дазволяць. На штосьці больш сур'ёзнае прэтэндаваць не варта. Калі захочаш праехацца, трэба спусціць машыну з аўтавоза. А для гэтага трэба спусціць яшчэ і ўсе тыя, што стаяць перад ёй. Таму «выпрабавальны» праезд можа каштаваць сотню еўра і больш. Дарэчы, варта ехаць адразу з еўрапейскай валютай — амерыканскія даляры не бяруць. Спатрэбяцца і літы, і — пры ўдалай пакупцы — беларускія рублі.




## Падарожжа па Літве

Горад Марыямпаль знаходзіцца за 50 км ад Коўна па трасе А5 і за 140 км ад Вільні па дарозе А16. Галоўны плюс гэтага аўтарынка — кругласутачная мытня. Сам аўтарынак працуе ў панядзелак і аўторак.

Рынак у Каўнасе працуе ўвесь тыдзень, але асноўны наплыў прадаўцоў назіраецца ў суботу. Дабрацца да яго нескладана — 100 км ад Вільні па трасе А1. У адрозненне ад Марыямпаля, машыны стаяць хаця б на асфальце, а не на цяжкапраходным пяску. Сайт рынку — http://www.kaunoturgus.lt.

Гаруны (Гарунай) — прыгарад Вільні, знаходзіцца на паўднёвы захад ад літоўскай сталіцы і чымсьці нагадвае мінскія Ждановічы. Аўтарынак з'яўляецца часткай рэчавага рынку і працуе ў чацвер і пятніцу.

У партовай Клайпедзе — самы далёкі ад Беларусі аўтакірмаш. Горад знаходзіцца за 310 км ад Вільні, калі ехаць па трасе А1. Па амерыканскія машыны варта ехаць менавіта туды. Машыны там прадаюцца з паромаў. Гэта яшчэ і адзіны рынак, дзе можна паспрабаваць разлічыцца з прадаўцом далярамі.

Сярод драбнейшых рынкаў вылучаецца Таўраге. Там найбольшы выбар недарагіх французскіх аўто. У горад можна трапіць па трасах А1 і А12. Ён знаходзіцца за 250 км ад Вільні. Рынку ў класічным разуменні слова ў Таўраге няма, а ёсць з дзясятак платных стаянак, на якіх прадаюцца аўтамабілі. Таму дабрацца туды можна толькі машынай.

Аўто, якія там прадаюцца, можна паглядзець на сайце http://www.autotaurage.lt.

Цэны на літоўскіх рынках мала розняцца. Шмат якія гаспадары пераганяюць аўтавозы з горада ў горад, каб трапіць на пэўны рынак у дзень яго асноўнай працы.

## Поруч з прафесіяналам

Паслугі кансультанта пры пакупцы машыны запатрабаваныя, бо не ўсе хочуць самі разбірацца ў тонкасцях афармлення дакументаў. Можна выправіцца ў арганізаваны тур па машыну, заплаціўшы 200—250 еўра. У гэтую цану ўваходзіць афармленне візы, дарога ў Літву, пражыванне і харчаванне ў недарагім гатэлі, транзітны нумар і страхаванне прыдбанага аўтамабіля. Кансультант едзе на аўтарынак разам з групай пакупнікоў, дапамагае ім афармляць дакументы і адпраўляе назад у Беларусь сваім ходам. Такі варыянт абіраюць людзі, не схільныя рызыкаваць і набіваць гузакі на лбе ў іншай краіне.

## Віртуальныя машыны

Тыя ж, хто верыць у свае сілы і хоча ашчадзіць, выпраўляюцца па машыну самастойна. Зразумела, што папярэдне трэба атрымаць візу (60 еўра). Літоўскае пасольства выдае іх без жорсткіх патрабаванняў. У пункце анкеты дастаткова пазначыць мэту — закуп аўтамабіля. Супрацоўніцы страхавых кампаній, якія працуюць ля пасольства, могуць падказаць адрасы некалькіх гатэляў, дзе вы маглі б спыніцца. Адзін з такіх адрасоў трэба ўпісаць у анкету. Калі ехаць на рынак сваёй машынай, яе трэба яшчэ застрахаваць — купіць «зялёную картку» (каштуе 30 еўра на 15 дзён).

Каб не ехаць у Літву наўздагад, можна спачатку паглядзець прапановы машын у інтэрнэце. Найбольшы выбар на http://auto.plius.lt, там змяшчаецца каля 100 тысяч прапаноў продажу. Калі ўдасца скантактавацца з прадаўцом, можна будзе ехаць не на рынак, а адразу да яго. Ці дамовіцца на сустрэчу бліжэй да беларускай мяжы. Інтэрнэт-апісанне машын нельга назваць дасканалым — часта прадаўцы пакідаюць аб'яву і больш не заходзяць на сайт, бракуе і інфармацыі пра канкрэтную машыну. Прадавец можа «забыцца» напісаць пра зламаную дэталь і паведаміць пра яе толькі падчас сустрэчы ў Літве.

## Увага: афармленне

Калі інтэрнэт-пошук не даў плёну, варта адпраўляцца на рынак. Якога алгарытму дзеянняў трымацца падчас пакупкі?

Пасля таго, як машына выбраная, гаспадар атрымлівае пад слова гонару задатак — 100—300 еўра — і копію пашпарта пакупніка. Трэба ўказаць, праз які памежны пераход будзе пераганяцца аўто, бо ён будзе пазначаны ў дакументах, а праз іншы машыну не пусцяць.

Праз некалькі гадзінаў купец атрымае машыну і патрэбныя дакументы. Гэта тэхпашпарт (брыф) з краіны, адкуль было ўвезенае аўто (часцей за ўсё гэта Германія ці Францыя), купчая на машыну з пазначанай датай першага продажу, даведка з літоўскага аналагу ДАІ, рахунак-даведка і «вываз» з указаным памежным пераходам. Тады ж выплачваецца і астатняя сума за машыну.

Далей на сваё імя трэба аформіць «Зялёную картку» (20 літаў — 6 еўра) і літоўскія транзітныя нумары (каля 50 еўра). За гэтую суму варта пагандлявацца з прадаўцом.

На беларускай мяжы трэба выплаціць размытнёўку і дакупіць страхоўку. Пасля вяртання дамоў на працягу дзесяці дзён неабходна паставіць машыну на ўлік.

## Што вязуць?

На аўтамабілі, старэйшыя за 10 гадоў, мыта большае амаль удвая. За машыну з рухавіком 1800 куб. см, зробленую да 2000 г., на мяжы прыйдзецца заплаціць 1350 еўра мыта, а за навейшую — усяго 720 еўра.

Таму найбольш вязуць у Беларусь недарагія б/к аўто 8—9-гадовай даўніны.

«НН» параўнала цэны, узяўшы пад увагу некаторыя машыны з тых, што ўвайшлі ў рэйтынг найлепшых аўтамабіляў дзесяцігоддзя.

**Ягор Марціновіч**

# Цэны ў аўтасалонах пакуль не падымаюць

У мінскіх аўтасалонах колькасць кліентаў з пачатку года скарацілася. «Ніхто не ходзіць. Цішыня, — адзначаюць у адным з іх. — Продажы ў параўнанні з мінулым годам упалі. Ажыятажу, звычайнага напярэдадні навагодніх святаў, і блізка няма».

Адны прадаўцы адсутнасць кліентаў тлумачаць павышэннем мытаў, іншыя — студзенем, традыцыйна неспрыяльным часам для пакупкі машын. Як бы ні было, цэны на многія аўтамабілі, завезеныя ў 2009 годзе, пакуль не падняліся. Запасаў на складах хопіць да вясны. Тады ўжо прыйдзецца завозіць новыя аўто.

Аўтасалоны не збіраюцца адмаўляцца ад паставак аўтамабіляў з ЕС. Хаця пытанні паставак машын расійскай зборкі таксама прапрацоўваюцца. Але тут існуе праблема, што многія папулярныя маркі ў Расіі не збіраюць. Да таго ж, як запэўнілі ў адным з аўтасалонаў, ва ўсходняй суседкі не хапае аўтамабіляў на патрэбы ўнутранага рынку.

**У аўтасалонах Nissan, Citroen, «Мульцімотарс», «Профімотарс» пабываў**
**Кастусь Матушыч**

# Прыгоды беларусак у Тайландзе

**Каб вярнуцца дахаты з адпачынку, праграмістцы з Мінска давялося заплаціць сем тысяч даляраў.**

«Гэтая паездка — экстрыму хоць адбаўляй. З учарашняга дня ездзім на мапедзе па гарах ды скалах, за рулём Леся, якая раней ніколі не кіравала, а я сяджу ззаду без шлема...», — такі допіс Наста Доду-Цілаева, мінская праграмістка, зрабіла ў сваім інтэрнэт-дзённіку ў першы тыдзень адпачынку ў Тайландзе. Далей былі шпіталь, зашытае калена і вусны, мыліцы, велізарны рахунак і вяртанне на радзіму, дзе лячэнне давялося працягнуць у аддзяленні гнойнай хірургіі.

Паездка ў Тайланд для Насці стала суцэльным экстрымам. Звыклая да еўрапейскіх візавых працэдураў, яна ў апошні момант даведалася, што афармленне візы ў Тайланд не патрабуе абавязковай страхоўкі. Часу было мала, і дзяўчына вырашыла рызыкнуць. Гэтая неабачлівасць абернецца для яе горкім жыццёвым урокам.

У Тайланд Насця выбралася з сяброўкай. Дзяўчаты спакусіліся невялікімі цэнамі на авіяпералёты ў Азіі — марылі наведаць Лаос, В'етнам, Камбоджу, Малайзію, Інданезію, Індыю... Яны пасяліліся на выспе Пханган, што за 55 км ад мацерыка. Выспа славіцца сваімі пляжамі. Сяброўкі знялі бунгала на беразе мора. Каштуе, як кватэра ў Мінску: $250 за месяц. Толькі ў мінскіх кватэрах вы не сустрэнеце вялізных павукоў і геконаў — яшчарак, якія вольна пачуваюць сябе ў прыбярэжных дамках. Яны мілыя і бясшкодныя.

На Пхангане дзяўчаты пазнаёміліся з дзясяткам беларусаў-праграмістаў, якія прыехалі сюды працаваць на заходнія кампаніі. Пачалі асвойваць мясцовасць.

Дзеля гэтага сяброўка Леся ўзяла напракат скутэр. «Там усе на скутэрах ездзяць — і стары, і малады», — кажа Насця. Прычым дарогі на Пхангане няпростыя — звілістыя, нібы змеі, прычым як у гарызантальнай, так і ў вертыкальнай плоскасці. Крутыя пад'ёмы чаргуюцца са спускамі. І кожную хвіліну трэба чакаць павароту. Ці аб'езду скалы. Ці выступу гары. «Мы паехалі па адной з самых небяспечных дарог на пляж палюбавацца захадам сонца», — прыгадвае Насця. Спускаліся з гары і не ўпісаліся ў паварот. У скалу ўрэзаліся на хуткасці каля 40 км у гадзіну. Ад удару мотацыклетны шлем ейнай сяброўкі раскалоўся. Насця стукнулася аб яго тварам, разбіла вусны, выбіла некалькі зубоў. Калена на левай назе дзяўчына рассекла да косткі. Лесі пашчасціла больш: ейныя траўмы хутка загаіліся і яна працягнула сваю вандроўку па Азіі.



На пакручастых тайландскіх дарогах нявечацца многія замежныя турысты.

### Асаблівасці тайландскай медыцыны

Зашыць рану Насці маглі толькі на суседняй выспе. Пакуль яна не заплаціла за транспарціроўку ў шпіталь на маторцы, яе нікуды не везлі. Першая дапамога каштавала каля 400 даляраў. На выспе Самуі беларуску паклалі ў адну з найлепшых клінік. Большасць пацыентаў тут — пацярпелыя ў дарожных аварыях. Найперш недасведчаныя кіроўцы скутэраў, турысты. «Мяне ніхто не пытаў, куды везці лячыць. Прывезлі, паклалі ў асобную палату з чароўнай кнопкай — націскаеш — і праз імгненне прыходзіць медсястра». Калена і вусны зашывалі двойчы.

«Мне здавалася, што хірург мяне проста ненавідзіць, такі суровы ў яго быў выгляд», — усміхаецца Насця. А тады ёй было не да смеху. Яна баялася, што яе знявечаць тут, у чужой краіне, і нічога яна не зробіць. «Тайцы, як мне падалося, жорсткія людзі. Пры мне маленькаму хлопчыку зашывалі рану на галаве. Дзіця плача, аж сэрца рвецца, а побач стаіць дзяцюк, паказвае на малога пальцам і рагоча», — прыгадвае Насця.

Сапраўдны ж шок наступіў, калі дзяўчына пабачыла рахунак — сем тысяч даляраў. Выратавала міжнародная банкаўская картка, на якую муж пераслаў неабходную суму. Інакш з краіны ее не выпусцілі б. З той жа прычыны сяброўка заплаціла гаспадару скутэра кампенсацыю ўдвая большую за тую шкоду. Дасведчаныя еўрапейскія турысты патлумачылі дзяўчатам, што лепей заплаціць, чым мець праблемы з паліцыяй і памежнай службай.

### Еўрапейская салідарнасць і беларуская абыякавасць

Пасля шпіталя Насця яшчэ колькі дзён правяла на Пхангане. Гэты час над ёй апекаваліся еўрапейскія турысты, пераважна немцы. Дапамагалі, чым маглі. «Прыставілі да мяне моцнага немца, ён насіў мяне на пляж». Удалечыні ад Еўропы немцы, швейцарцы ды англічане падаваліся амаль сваімі, прыгадвае Насця. На фоне падкрэсленай абыякавасці тубыльцаў яны дэманстравалі зайздросны прыклад ўзаемадапамогі — вучылі недасведчаных турыстак асаблівасцям мясцовага турбізнэсу, дзяліліся карыснымі парадамі, не дазвалялі апускаць нос. А вось знаёмыя землякі ні разу не пацікавіліся справамі дзяўчат, хоць і ведалі пра іхнюю бяду. Затое тройчы патэлефанавалі расійцы, якія першымі пабачылі беларусак пасля катастрофы і выклікалі медыкаў.





Стаўленне тайцаў да замежнікаў Насці не спадабалася. «На цябе там глядзяць выключна як на кашалёк. Важныя толькі твае грошы. Гасціннасці, характэрнай для еўрапейцаў, я там не адчула». Ёй трэба было ездзіць у гарадскі шпіталь на перавязкі. Гаспадыня бунгала, якая штодня ездзіла ў горад па харч, толькі двойчы падвезла яе. Узяўшы пасля плату, як за таксоўку. Таксоўшчыкі, калі бачылі дзяўчыну на мыліцах, заломвалі падвойную цану — а куды яна дзенецца? Даецца ў знакі замежнікам і моўны бар'ер: большасць тутэйшых англійскую мову ведае кепска.

### Вяртанне

Дамоў Насця паехала адна — сяброўка працягнула вандроўку з надзеяй адшукаць працу праграміста. Шлях заняў два дні: лодкай да кантынента, аўтобусам да бліжэйшага горада, цягніком да Бангкока, адтуль самалётам да Масквы, са сталіцы Расіі самалётам дамоў. У маскоўскім аэрапорце Насці стала кепска — рана пачала гніць. У Тайландзе падчас перавязак ёй проста мянялі старыя бінты на новыя, прамывалі рану цёплай вадой. У мінскім аэрапорце яе чакала «хуткая». Тайландскі рай абярнуўся ложкам у палаце гнойнай хірургіі.

«Першы раз я паехала за мяжу без страхоўкі. І апошні!» — кажа Насця. Яна расказвае, як у шпіталі часам сніла, што ўсё яшчэ знаходзіцца ў Тайландзе. Прачыналася і радавался шэрым сценам палаты мінскай бальніцы — я ў Беларусі!

Сямён Печанко



Тайландскі рай абярнуўся для Насці доўгім лячэннем.

**Турыст у Тайландзе мусіць мець:**

– страхоўку;

– актыўную міжнародную банкаўскую картку.

**Дарожны рух**

у Тайладзе левабаковы. І надзвычай інтэнсіўны.

**Арэндуючы скутэр,**

правярайце яго тэхнічны стан. Пазначайце ўсе пашкоджанні ў спецыяльнай форме. Папрасіце прадаўца навучыць вас карыстацца мапедам.

**Англійскую мову**

ў Тайландзе ведаюць нямногія. Будзьце гатовыя да моўных праблемаў.

**Харчавацца**

танней мясцовымі стравамі. Смажаны рыс з гароднінай, морапрадуктамі ці мясам каштуе каля даляра за порцыю. Еўрапейскія стравы ў кавярнях і рэстаранах — ад сямі даляраў. У вялікіх паселішчах працуюць гіпермаркеты. Там можна набыць еўрапейскія і амерыканскія прадукты па цэнах, параўнальных з беларускімі.

# Савецкія рэаліі беларускай школы

Сённяшняя школа выхоўвае безыдэйнае пакаленне. Расказвае Андрэй, педагог-арганізатар адной з мінскіх школ.

**«Наша Ніва»: У чым сэнс працы педагога-арганізатара?**

**Андрэй:** Мая галоўная задача — арганізацыя ў школе мерапрыемстваў. Напрыклад, канцэртаў, прысвечаных афіцыйным святам. Праводзім конкурсы, віктарыны. Таксама ў мае абвязкі ўваходзіць праца з актывам школы — членамі БРСМ, піянерамі, акцябратамі...

**«НН»: Акцябратамі?!**

**А:** Так, у сучаснай школе ёсць акцябраты. Спачатку спрабавалі ўжываць назву «спадкаемцы». Бо, маўляў, павінны захоўваць багатую гістарычна-гераічную спадчыну краіны. Аднак не прыжылося. Ужываюць звыклы тэрмін — акцябраты. Толькі ў нашага аналага зорачка без Леніна, дый дзецям распавядаюць легенду пра добрага хлопчыка Акцябронка, які ўсім дапамагаў...

**«НН»: І вераць?**

**А:** Школьнікі зорачку не носяць: у акцябраты прынялі, а чаму менавіта зорачка — не паяснілі.

**«НН»: А як жа піянеры без Леніна?**

**А:** Тут праблема. Кіраўніцтва школы само не можа даць ідэалагічнае азначэнне піянеру. Як у тым анекдоце: «Мама, у школе сказалі, што піянер — гэта той, хто не лаецца матам, дапамагае старэйшым, аберагае прыроду. Дык нашто мне ўступаць у піянеры, калі я і так усё гэта раблю?»

Але структура піянерскай дружыны — як у савецкія часы. Важатым абавязкова павінны быць прадстаўнік БРСМ. Нават «цімураўцы» існуюць.

**«НН»: Пра ініцыятывы піянераў і БРСМ столькі пішуць!**

**А:** Мерапрыемствы, якія праходзяць у школе, павінны адбывацца нібы па ініцыятыве БРСМ, піянераў, акцябратаў. Хаця звычайна гэта на паперы. Мне трэба аформіць дзесяць тэчак, якія будуць асвятляць жыццё нашай піянерскай дружыны. А як звязаць школьныя мерапрыемствы з піянерамі? Гэта ўжо мае праблемы.


PHOTO.BYMEDIA.NET

На першым месцы ў школе паперы, а дзеці — як удасца.

Яшчэ трэба два стэнды з інфармацыяй аформіць. Зрабіць піянерскую горку: барабаны, горн, чырвоны сцяг і... мішку. Так, сімвал сучаснай піянерскай арганізацыі — мядзведзь. Як мне патлумачыла адна з настаўніц — мішка добры і ўсім дапамагае. Смяяцца з такога азначэння ці плакаць — невядома.

Сцяг каштуе 50—70 тысяч рублёў. За чые грошы набываецца — нідзе не прапісана. Са школьнай сталоўкі адкіды на кані адвозяць, адкуль у школы грошы? Прыйдзецца набываць за свае.

**«НН»: Ці ёсць у школе «беспартыйныя»?**

**А:** Усяго ў школе 750 вучняў. 250 з іх уваходзяць у дзіцячыя і падлеткавыя арганізацыі. Дзецям нецікава слухаць пра тое, як прэзідэнт у дзяцінстве прасаваў піянерскі гальштук. Леніна Лукашэнкам у гэтай сітуацыі не заменіш, як ні круці...

**«НН»: Ці ладзяцца ў школе мерапрыемствы, скіраваныя на прапаганду беларускай культуры?**

**А:** Такіх мерапрыемстваў школа ўвогуле не ладзіць. Я сам у паўсядзенным жыцці карыстаюся беларускай мовай. Калі пры найме на працу падпісваў кантракт, першае, пра што запыталіся — ці не ўваходжу ў БНФ (страшная такая абрэвіятура для савецкіх начальніц) і ці не збіраюся прапагандаваць сярод дзяцей «антыдзяржаўныя ідэі».

Затое запланаваная ганаровая вахта памяці ля вечнага агню на плошчы Перамогі. Усе раёны Мінска нясуць вахту па чарзе. Дзеці павінны пасаваць пад пэўныя памеры, прыйсці ў аднолькавай вопратцы, як хлопчыкі, так і дзяўчынкі. Дваццаць пяць чалавек. Дзе мне іх шукаць, каб усё сышлося са стандартамі? І з жаданнямі? Зразумела, большасць прымусяць.

Наша вахта выпадае на зіму. І тое, што дзяўчынкі будуць стаяць на марозе ў спадніčках, нікога не цікавіць! Чатыры дні. Ніякіх умоваў, каб пераапрануцца. Пры канцы — са школьнікаў баявы лісток, а школе — адзнаку. Якая, ведаючы нашых бюракратаў, даўно ўжо выстаўленая. У такіх выпадках больш за ўсё шкада дзяцей.

**Ганна Журавіна, Мінск**

**Заробак педагога-арганізатара**

складае ад 330 да 450 тысяч рублёў. Гэта больш, чым стаўка дзіцячага псіхолага — 220 тысяч.


SVABODA.ORG

## Дзівак, на якім трымаецца «Спадчына»

Анатолю Беламу — 70. Піша Захар Шыбека.

Анатоль Белы адсвяткаваў уласную круглую дату разам з грамадска-асветніцкім клубам «Спадчына», які стварыў яшчэ за саветамі, 25 гадоў таму, і прыватным музеем прыкладнога мастацтва, які арганізаваў 10 гадоў таму. Як гісторыку, мне невядома, каб хто-небудзь іншы арганізаваў у Беларусі прыватны мастацкі музей.

Маё знаёмства з беларускім асветнікам пачалося ў 1971 г. у сценах БДУ, дзе быў лётчык спасцігаў навуку і выкладаў філасофію.

Культурна-асветніцкі клуб «Спадчына» стаў для дацэнта філасофіі своеасаблівым аэрадромам узлёту да вяршынь беларускасці. Ён рабіў тое, што не было запатрабаваным дзяржавай.

Арганізоўваў у Мінску са сваіх збораў часовыя выставы медалёў, твораў беларускіх мастакоў, якія жывуць у ЗША.

На сродкі, сабраныя па ініцыятыве лідэра клуба «Спадчына», былі створаны помнікі Максіму Багдановічу ў Яраслаўлі, Францыску Скарыну, Міколу Гусоўскаму, Кірылу Тураўскаму ў Мінску (дворык БДУ), Ларысе Геніюш у Зэльве, Міколу Ермаловічу ў Маладзечне.

З 2006 г. у дзейнасці «Спадчыны» з'явіўся новы накірунак. У сеціве пачалі ствараццца сайты.

Урэшце, няўрымслівы калекцыянер адкрыў мастацкі музей у бацькоўскім доме, што ў Старых Дарогах. Побач са старым домам былі ўзведзены чатыры новыя будынкі на два паверхі. Экспазіцыйная плошча перасягнула 500 кв.м. У музейных залах размешчана больш за 1200 твораў мастацтва.

А каля музея стаяць помнікі і памятныя знакі беларускім дзеячам, у тым ліку памятны знак у гонар Васіля Быкава (валун з бронзавым медальёнам).

У зборы матэрыялаў пра замежжа Анатолю Беламу дапамагае дачка Святлана, якая жыве ў ЗША і выпускае там гістарычны часопіс «Полацак». Надзейным памочнікам у музейнай справе выступае і жонка Ала Мікалаеўна.

Усе справы юбіляра цяжка і пералічыць. Доўгі час дзейнасць Анатоля Белага была мала вядома грамадскасці. Проста замоўчвалася. Лічылася дзівацтвам. І я неяк не прымаў усур'ёз тыя самадзейныя справы, што павінна была, на маю думку, рабіць дзяржава. Але час паказаў, што гэта не асобны выпадак амбітнасці і дзівацтва, што пры існуючай беларускай дзяржаве самадзейнасць была зусім неабходнай. І каб не Анатоль Белы з яго камандай, Беларусь яшчэ больш бы страціла і яшчэ больш не набыла б.

Болей бы такіх няўрымслівых людзей як Анатоль Белы.

## Трэба з чагосьці пачынаць

Я нарадзілася і жыла ў вёсцы 13 гадоў. Мой брат — на чатыры гады менш. Нам гэтага хапіла, каб зусім не зблудзіць у рознакаляровым і рознапачуццёвым жыцці. На пачатку снежня была ў роднай вёсачцы. Там так пуста зараз.

Я з вамі пазнаёмілася ў 2005-м. Адзіны нумар, што трапіў да мяне ў той час, не крануў. Таму што была зусім цёмная. Потым былі людзі, размовы, адкрыццё свету не толькі з тых бакоў, якія на паверхні.

Яшчэ ў дзяцінстве, з незразумелай мне прычыны, цяжка і непрыемна было чытаць некаторых аўтараў. Як аказалася, яны пісалі няпраўду. А Чалавекам сябе адчуваеш толькі калі жывеш у сапраўдным свеце, у свеце без падману. Мяне ратуе прыроднае пачуццё сапраўднага, пачуццё, якое дадзена ад нараджэння.

Што казаць, і ў вас бывае ўсяляк. Але гэтага «ўсяляк» няшмат.

...Мая кульгавая беларуская родная мова. Прабачце, якая пакуль ёсць. Трэба з чагосьці пачынаць.

Я нарадзілася і жыла ў вёсцы 13 гадоў. Мой брат — на чатыры гады менш. Нам гэтага хапіла, каб зусім не зблудзіць у рознакаляровым і рознапачуццёвым жыцці.

На пачатку снежня была ў роднай вёсачцы. Там так пуста зараз. Была вёска, стала вёсачка. Параз'язджаліся, паспіваліся, папамiралі. Калгас на апошнім уздыху. На полі ў пачатку зімы шмат нязвезенай саломы. Хоць бы людзі пакралі, дык для справы пайшло б. А так гніе праца...

Ад прыпынку аўтобуса да бабульчынага дома каля двух кіламетраў. Ішла ў сем гадзін вечара, усё вуліцай — і толькі адзін сабака на мяне забрахаў. Сумна.

Бацька п'е. Стаў падобны да лесавіка. Не стрымаўся, калі не стала працы. І маці яго не стрымала. Кінула яго і з намі, дзецьмі, падалася ў горад.

Горад сапраўды псуе. Больш спакусы. Але ж наша вясковая моладзь п'е не менш, чым тыя, што швэндалі пад балконамі кватэры на першым паверсе, дзе мы жылі першым часам. Толькі ў горадзе бананамі закусвалі ды чыпсамі, а на вёсцы — салам з хлебам. Якраз пад акном таго пакойчыка, дзе я жыла, чуліся п'яныя размовы, а ўранні валяліся лушпінні ад бананаў.

У студзені мой братка будзе атрымліваць газету «Наша Ніва» штотыднёва. Спраўдзіцца яшчэ адно ягонае жаданне. Дарэчы, ваша газета адзіная, якую ён чытае.

Я па-за межамі ўсялякіх арганізацый. Калі вучыліся ў школе, ад няма чаго рабіць запісалася ў БРСМ, а калі мой членскі білет трапіў у пральную машыну, узрадавалася. На душы стала лягчэй. Бо, каб рабіць добрыя справы, не абавязкова ўступаць у саюзы.

Мае першыя крокі да самасвядомасці — Караткевіч. Потым людзі, мой дзядуля, ваша газета. У гэтым годзе пазнаёмілася з часопісам «Дзеяслоў». Вывучаю гісторыю Беларусі. Сябра з Гродна дасылае дакументы і факты, кажа: «Хопіць есці чыесьці інтэрпрэтацыі». Прыйшоў час складаць свой светапогляд.

**Алена, Бабруйск**

## Пераднавагоднія сюрпрызы

...зайшоў у хату і знайшоў там ажно тры боханы свежага хлеба, пакінутыя чамусьці немцамі. Успамін з 1944 года.

Снежань 66-гадовай даўнасці быў нават цяплейшы, чым сёлетні. Ні табе марозу, ні слаты. У тыя дні мне, 12-гадоваму хлапчуку, даводзілася ў лесе пасвіць кароў. Сваю і тых людзей, якія вымушаны былі жыць у зямлянках Забылінскага лагера, што знаходзіўся ў вялікім лесе на захадзе Расонскага раёна.

Паскубаўшы ў бары верасу і брусніčніку, каровы падаліся да балота. Папіць вады і пакаштаваць пажарніцы, хоць яна была не такая смачная, як зялёная ўлетку.

Каровы ходзяць па беразе, а я, наглядаючы за імі, тэпаю каля яліны. Ціха, спакойна. Раптам данёсся самалётны гул, з-за дрэў вынырнуў «кукурузнік». І на сярэдзіну балота пачалі падаць бомбы.

Нямецкі лётчык зрабіў так, каб нікому не зашкодзіць: ні людзям, ні жывёлам, ні дрэвам. Скінуў бомбы на пустое балота. Я з цікаўнасці збегаў туды. Убачыў чатыры яміны-варонкі паблізу адна ад адной. З краёў са свежай багны сачылася вада.

Загнаўшы кароў у шалашы, зробленыя з яловых лапак, я падаўся ў зямлянку, Дзе на вогнішчы ў прыску пяклася бульба. І тут мяне чакала прыемная навіна.

Удзень адзін добры дзядзька наведаў сваю хату ў вёсцы Задорына. Дзеля гэтага трэба было рызыкаваць жыццём. Бо ягоная вёска знаходзілася побач з Сакалішчам, дзе стаялі немцы.

Усё абышлося добра. Чалавек пераехаў на пароме, схаваным у кустах, рэчку Нішчу, зайшоў у хату і знайшоў там (во шчасце!) ажно тры боханы свежага хлеба, пакінутыя чамусьці немцамі.

Цяпер гэты хлеб добры дзядзька дзяліў. Кожнаму хлопчыку і дзяўчынцы, што былі ў лагеры, дасталася луста хлеба, якога яны даўно не елі і які здаўся вельмі-вельмі смачным.

Усяго зведалі дзеці вайны. Бачылі і кроў, смерць. Цярпелі голад і холад. Але ж былі і прыемныя сюрпрызы. А добрае не забываецца.

**Мікола Бадзюкоў, Полацк**

## Самалётам — гэта танна

Танныя рэйсы лётаюць з Польшчы і Літвы.

Звычайнае беларускае ўяўленне пра самалёт — гэта дорага! Так, пералёт з Мінска ў Прагу і назад будзе каштаваць 300 еўра. Але ў Еўропе вялікая канкурэнцыя авіякампаній. Яны спрабуюць перацягнуць кліентаў, прапаноўваючы пералёты па супернізкіх коштах. Найбольш вядомыя сярод такіх — Wizzair, Ryanair. Кампаніі маюць сайты, на якіх можна даведацца цэны і адразу набыць квіток. Толькі сачыце ўважліва: цэны змяняюцца амаль кожны дзень.

Мне пашчасціла знайсці варыянт Катавіцы (недалёка ад Кракава) — Мілан за 40 еўра ў абодва бакі. Лепш за ўсё, браніруючы квіток на сайце, у раздзеле багаж пазначаць «0» і браць з сабою на борт заплечнік. Толькі пазнаёмцеся са спісам дазволеных рэчаў у ручным багажы.

Я карыстаўся сайтам www.wizzair.com. Спачатку рэгіструемся, падбіраем напрамак. Найбольш танныя вылеты для беларусаў — з Кіева (Украіна), Варшавы і Катавіц (Польшча). (З Беларуссю авіякампанія не працуе.) З Польшчы выбар напрамкаў большы. Запаўняем патрэбныя палі і даходзім да формаў аплаты: грашовы перавод альбо пластыкавая картка. У Беларусі толькі «БПС-Банк» робіць карткі для інтэрнэт-аплатаў. Картка называецца Visa Virtuon, каштуе восем тысяч, вырабляецца тыдзень. Абавязкова трэба замаўляць картку для аплат у еўра ці далярах. Як яе атрымалі, праз банк залічылі грошы на картрахунак — можна замаўляць тур на самалёт і аплачваць. Затым на e-mail прыходзіць пацверджанне, што пералёт аплачаны. За некалькі дзён да вылета кампанія яшчэ і нагадае, што прыйшоў час збірацца ў вандроўку.

**Павел Белавус, Брэст**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Беларускае аўто для караля Іспаніі

**Першым айчынным легкавіком быў не «Саманд». У пачатку XX стагоддзя ў Вільні рабілі «Хадкары» для каралеўскіх двароў Еўропы. Расказвае аўтакалекцыянер Васіль Цярэшка.**

**«Наша Ніва»: Спадар Васіль, чым займаецца Таварыства абароны помнікаў тэхнікі і транспарту «Наша Перамога», якое вы ўзначальваеце?**

**Васіль Цярэшка:** Мы збіраем, рэстаўруем рэтра-тэхніку, арганізуем святы, рэтра-прабегі. Зараз актыўна супрацоўнічаем з «Беларусьфільмам». Калі раней кінастудыя толькі арандавала рарытэтны транспарт у сяброў таварыства, дык цяпер да нас звяртаюцца з замовамі вырабіць дзейныя макеты транспартных сродкаў для фільмаў. Апошняе, што мы рабілі, — «палутарку» для фільма «Брэсцкая крэпасць». Працавалі ўдвух шэсць тыдняў. Выйшла, як у перадачы на канале Discovery, дзе аўто робяць за чатыры тыдні, але большай камандай.

**«НН»: А якія самыя распаўсюджаныя замовы з кінастудыі?**

**ВЦ:** У асноўным аўтамабілі. Але раз замаўлялі макет англійскага самалёта «Сопвіч» часоў Першай сусветнай. Ён быў задзейнічаны ў фільме «Выратаваць імператара». Не лётаў, праўда, але шпарка бегаў па лётным полі. Пасля здымак, па прыкрай кіношнай завядзёнцы, яго хацелі знішчаць. А мы не дазволілі. І сёння «Сопвіч» знаходзіцца ў музеі-запаведніку ў вёсцы Заброддзе Вілейскага раёна, які мясцовыя жыхары называюць часткай «Лініі кайзера».



Цярэшка на Zundapp.

## Ровар на драўляных абадах

**«НН»: З чаго ў вас пачалося захапленне рарытэтамі на колах?**

**ВЦ:** З дамскага ровара 1953 года вытворчасці, які я бясконца рамантаваў. Спачатку яго прыгожая рыжская дамская рама трансфармавалася ў мінскую мужчынскую, пасля на ровары з'явіўся рухавік...

Першы аўтамабіль я купіў у Польшчы — грузавічок «Жук». Як кажуць палякі, «то ест не звыклы самоход, то ест самоход польскі!»

А мой трэці «Жук», мікрааўтобус, быў той машынай, якая вывезла гурт «Стары Ольса» на іх першыя замежныя гастролі. Я прышчапіў краўніку «Старога Ольсы» Змітру Сасноўскаму захапленне рэтра-транспартам. Летась ён набыў два рарытэтныя аўто — пачатак калекцыі, якую мы збіраем разам.

**«НН»: Калекцыя ўжо вялікая?**

**ВЦ:** Не надта. Некалькі мадэляў савецкіх матацыклаў, нямецкі Zundapp, мотакаляска «Маргуноўка», «Перамога», «Масквіч-401», «Запарожац», «Ныса»... Але самае каштоўнае — першы беларускі ровар «Нёман». Вырабілі яго ў 1930-х у Гродне. На раме чытаецца лацінкай «Nieman», ёсць выявы старога і новага замкаў. Праўда, наш экзэмпляр не мае колаў... Колы былі шырокія, як у сучасных горных ровараў. Абады — драўляныя з металічнымі спіцамі. Мару адрастаўраваць яго.

**«НН»: І ў іншых сяброў таварыства, напэўна, таксама ёсць свае калекцыі?**

**ВЦ:** Так. Андрэй Міцкевіч, да прыкладу, валодае «Перамогай» Якуба Коласа. Ёсць «Эмкі», «Палутаркі», дзваенныя «Адлер», «Б'юік», «Віліс»... На жаль, мала айчыннага транспарту. Толькі першыя МАЗы, мінскія матацыклы і ровары.

## Шукайце ў Брытанскім каралеўскім гаражы

**«НН»: А хіба айчынная аўтавытворчасць такая багатая?**

**ВЦ:** Першы беларускі аўтамабіль, пра што мала хто ведае, быў выраблены яшчэ ў пачатку XX ст. у Вільні. Называўся ён «Хадкар», па прозвішчы ўладальніка прадпрыемства і галоўнага канструктара, беларуса Станіслава Хадкевіча. Усяго было выраблена 15—16 аўто. Рухавік на «Хадкар» ставіўся амерыканскі, кузаў і ўсё астатняе рабілася ў нас. Гэта быў шыкоўны элітарны аўтамабіль. Прадавалі яго выключна каралеўскім дварам Еўропы. Адзін быў дастаўлены каралю Іспаніі, яшчэ адзін — каралю Вялікабрытаніі. Ёсць звесткі, што першы «Ролс-ройс» быў вельмі падобны да «Хадкара».

**«НН»: Чаму «Хадкараў» было выпушчана так мала? І дзе падзеліся астатнія?**

**ВЦ:** Гэта трэба высвятляць гісторыкам. Калі добра пашукаць у Брытанскім каралеўскім гаражы, знойдзецца наш экзэмпляр. А мала аўто зрабілі таму, што гэта былі вельмі дарагія машыны, рабіліся на замову. І неўзабаве пачалася сусветная вайна, стала не да раскошы.

## Нібы за штурвалам самалёта

**«НН»: Сябры таварыства набываюць рэтра-транспарт, каб на ім ездзіць, ці толькі каб палашчыць вока?**

**ВЦ:** Машына жыве, пакуль рухаецца. Дзесяць гадоў таму я штодзённа ездзіў на «Перамозе». Зараз нашмат больш машын на дарозе, хуткасці іншыя. Штодзённая язда на рарытэце напружвае: адзінае люстэрка ў салоне, задняе акенца маленькае... Але старыя аўтамабілі прыносяць задавальненне. Уражанне, нібыта сядзіш за штурвалам самалёта. Тумблеры, рычажкі, заслонкі — ніякай электронікі.

**«НН»: За колькі сёння можна набыць, напрыклад, «Перамогу» 1951 года?**

**ВЦ:** Як пашанцуе. Ад 100 даляраў і вышэй. У нас няма рынку старых аўто. Кожны ўладальнік выстаўляе свой кошт. Нерэстаўраваная машына танная, бо жалеза нічога не каштуе. Каштуе праца. А каб зрабіць машыну, укамплектаваць яе, трэба гады. І ў нас гэтым займацца дорага. Калі паехаць у ЗША, зняць там гараж, купіць, напрыклад, «Ford-T» 1919 года, пачаць рэстаўраваць, выйдзе нашмат, танней і якасней, чым у Беларусі адрэстаўраваць «Перамогу» 1951 года.

**«НН»: Вашы калекцыі — закрытыя. Мо варта стварыць музей рарытэтнага транспарту?**

**ВЦ:** Безумоўна. Ідэя ў нас такая ёсць, і мы не пакідаем надзеі яе ўвасобіць у жыццё. Праз вашае выданне хацеў бы звярнуцца да людзей: калі хто мае старыя ровары, брычкі, іншую рарытэтную тэхніку ў любым стане, не выкідайце: звяртайцеся да нас. Усё гэта можа стаць экспанатамі будучага музея тэхнікі і транспарту.

**Гутарыў Кастусь Матушыч**




«Ролс-ройс» 1904-1906.

## СЦІСЛА



Юлія Дарашкевіч

### Полацк — культурная сталіца Беларусі

Самы старажытны горад Беларусі афіцыйна атрымаў статус «Культурная сталіца краіны — 2010». З ініцыятывы Міністэрства культуры культурная сталіца цяпер будзе вызначацца штогод.

### 27 гадзін Ермаловіча

Адраджэнская метафара пра націсканне клавішы ВКЛ у беларускіх галовах (то бок, настойлівага інфармавання беларусаў пра іх мінуўшчыну дзеля актывізацыі гістарычнай памяці) набыла гэтымі днямі наўпросты сэнс. У кампаніі «БелТонМедыя» выйшла аўдыёверсія кнігі Міколы Ермаловіча «Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае». «Гаваркая» кніга складаецца з двух дыскаў, маючы агульны час запісу 27 гадзінаў. Начытаў тэкст прафесар Андрэй Каляда, які раней агучваў раманы Караткевіча ды Мележа.




**«Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае».** Серыя «Аўдыёкнігазбор». — Мінск: «БелТонМедыя», 2009.

### «Грунвальдская бітва» ў Навагрудку

600-годдзе бітвы пад Грунвальдам сёлета адзначаць і ў Навагрудку. Ініцыятыва сыходзіць ад міністра культуры, аднак свята не ўнесена ў рэспубліканскі спіс, таму будзе рэгіянальным. Мінкульт даручыў, каб сцэнар свята распрацаваў Вячаслаў Панін — знаны рэжысёр вялікіх мерапрыемстваў

У рамках святкавання адбудзецца Пяты навагрудскі фэст сярэднявечнай культуры.

### Паэтка Вальжына Морт атрымала амерыканскую прэмію

Літаратурныя прэміі Фундацыі Лэннэна прысуджаюцца як вядомым, так і маладым «аўтарам надзвычайных літаратурных якасцяў, якія зрабілі значны ўнёсак у ангельскамоўную літаратуру і выяўляюць патэнцыял для далейшай яскравай працы».

«Яе творы — крык душы аўтара, які піша пра змаганне роднай Беларусі за ўласную мову і ідэнтычнасць. Вершы прасякнуты тонкай лініяй барацьбы паміж цынізмам і патрыятызмам: Беларусь для Морт — рубец на яе сэрцы», — напісаў у рэцэнзіі да кнігі Морт «Фабрыка слёз» аўтарытэтны часопіс New Yorker.

Адначасова Морт выкладае ва ўніверсітэце Балтымара (ЗША). Яе муж, амерыканец, — уладальнік незалежнай студыі гуказапісу.

**СМ; Лявон К; Кастусь Лашкевіч, Tut.by**

# Сляды каралевы Боны

**Стаўленне да італьянцаў у часы Рэнесансу можна параўнаць са стаўленнем да амерыканцаў у сучасным свеце. Піша Алег Дзярновіч.**

На пачатку XVI ст. на Апенінскай паўвыспе жыло каля дзесяці мільёнаў чалавек. У той час насельніцтва ўсяго гіганцкага Вялікага Княства Літоўскага налічвала мільён і шэсцьсот тысяч чалавек. Італія мяжы XV—XVI стст. была адным з самых урбанізаваных краёў Еўропы. На яе Поўначы каля чвэрці насельніцтва жыло ў гарадах. Насельніцтва Неапаля дасягала 150 тысяч чалавек, Венецыі і Мілана — па 100 тысяч, Рым, дарэчы, са сваімі 50 тысячамі месцічаў выглядаў сціплей.

Італьянцы былі абсалютнымі лідэрамі ў металаапрацоўцы (ці не адтуль італьянскія традыцыі аўтамабільнага дызайну?), адукацыі, архітэктуры, гандлі. Італьянскія купцы трымалі траціну экспарту англійскай воўны. Яны займалі ключавыя пазіцыі ў эканоміцы Іспаніі і Францыі.

У эпоху Рэнесансу італьянская культура займела ў Еўропе дамінуючыя пазіцыі. Не толькі мастацтва і навука, але таксама італьянскія прынцэсы і каралевы ўпрыгожвалі сталіцы Еўропы. Французскі каралеўскі двор часоў Кацярыны Медзічы — маці караля Рэчы Паспалітай Генрыха Валуа — размаўляў па-італьянску.

Але італьянцаў не любілі — дзеля іх паўсюднай прысутнасці, майстэрства, кваліфікацыі, талентаў. У XVII ст. аб'ектам такой «народнай нелюбові» ў Францыі быў кардынал Джуліё Мазарыні — першы міністр ад 1642 да 1661 года. Яго апісваюць як чалавека хітрага і цынічнага, але таленавітага і адукаванага. Хоць Мазарыні здабыў вядомасць як мецэнат і бібліяфіл, а ягоны кнігазбор паклаў пачатак Нацыянальнай бібліятэцы Францыі, чытачам больш вядомы яго буфанадны вобраз, створаны Аляксандрам Дзюма ў рамане «Праз дваццаць гадоў».

### Чужаземка Бона

У Беларусі часоў Рэнесансу Мазарыні насіў спадніцу. Прынамсі, стаўленне жыхароў ВКЛ да каралевы Боны Сфорца нечым нагадвае эмоцыі, якія выклікаў у французаў іх першы міністр.

Дачка міланскага герцага Джавані Галеацы Сфорца, яна ў 1518 г. стала жонкай вялікага князя літоўскага Жыгімонта. Кажуць, менавіта Бона, значна маладзейшая за сужэнца, дала яму мянушку «Стары», з якой кароль і застаўся ў гісторыі.

У новую айчыну Бону суправаджала світа з трохсот італьянцаў. Разам з гэтай тлумнай кампаніяй на кракаўскім ды віленскім дварах з'явіліся ўсе культурныя, тэхнічныя і спажывецкія прыхільнасці эпохі Рэнесансу. Напрыклад, мода спажываць салату і іншую гародніну, звычка есці відэльцам. Навіна пашыралася спачатку ў арыстакратычных колах, а пасля даходзіла і да шарачкоў.

Але Бона не абмяжавалася такой прыемнай адукацыйнай місіяй. Каралева мела сваю жорсткую палітычную лінію, што выклікала шалёнае абурэнне ў магнатаў. Бона імкнулася ўзмацніць палітычную ўладу і эканамічную моц манархіі. Каралева зрабіла перагляд права трымання феадаламі дзяржаўных (вялікакняскіх) зямель. Яна выкупляла ды вяртала ў судовым парадку ў склад вялікакняскіх уладанняў многія зямлі, якія рознымі шляхамі прыдбала магнатэрыя Вялікага Княства.

У гаспадарскіх маёнтках уводзіліся прынцыпы інтэнсіўнага вядзення гаспадаркі (меліярацыя, палепшаны севазварот), узмоцненага, але ўнармаванага падаткаабкладання. Рэформы Боны сталі прэлюдыяй да маштабнай Валочнай памеры 1557 г., праведзенай у дзяржаўных маёнтках ужо яе сынам Жыгімонтам Аўгустам.

Такая актыўнасць жанчыны, няхай і жонкі ўладара, ішла насуперак уладнай традыцыі — польскай і больш кансерватыўнай ліцвінскай. Раней каралевы і вялікія княгіні абмяжоўваліся культурна-рэлігійнай дзейнасцю, што забяспечвала ім папулярнасць і ўдзячнасць падданых. Бона ж раздражняла актыўнасцю. Раздражняла магнатаў прагабсбургскай партыі, бо была антаганістам уплыву аўстрыякаў-Габсбургаў. Раздражняла ўсю шляхту праектамі гаспадарчых рэформ ды імкненнем да ўзмацнення цэнтральнай улады. Раздражняла іх усіх разам дынамічнай гаспадарчай дзейнасцю і актыўнай нацыяналізацыяй, як сказалі б сёння, зямельных уладанняў, якія ўспрымаліся як база моцнай улады.

На нервы дзейнічала і тое, што Бона ўплывала на свайго мужа-караля. І Жыгімонт, падобна, прыслухоўваўся да яе. Да прыкладу, Бона настаяла, каб кароль даў указанне перакласці Статут ВКЛ 1529 г. са старабеларускай мовы на лаціну, што адразу зрабіла гэты прававы помнік агульнаеўрапейскім дасягненнем.

У ВКЛ галоўным антаганістам Боны быў лідэр «сепаратыстаў» Альбрыхт Гаштольд, канцлер і віленскі ваявода. Бона судзілася з ім, імкнучыся вярнуць захопленыя дзяржаўныя маёнткі. Гаштольд вінаваціў каралеву ў парушэнні правоў шляхты Вялікага Княства.

Шляхта абвінавачвала Бону, што маёнткі, якія тая выкупляла, абсаджваліся «гультаямі і чужаземцамі». Апроч таго, шляхта непакоіў прывід італьянскага абсалютызму, вядомага з твораў тагачаснага паліттэхнолага Макіявелі. У вачах шляхты Бона была Макіявелі ў спадніцы.

> У вачах шляхты Бона была Макіявелі ў спадніцы.

Чорная легенда Боны пачала ўзнікаць яшчэ пры жыцці каралевы. У 1530—1540-х з'яўляліся вершы і ананімныя пасквілі, дзе нават інтэлект Боны падаваўся падазроным, а ў форме каламбуру сцвярджалася, што ў краі ўладарыць не кароль (regnavit), але каралева (reginavit). Польскія дасціпнікі параўноўвалі каралеву з вавельскім цмокам, якому, паводле легенды, патрабаваліся ўсё новыя ахвяры. Падобныя вершыкі пашыраліся па ўсёй Еўропе і траплялі, напрыклад, да лідэра Рэфармацыі Марціна Лютэра. Сярод шляхты хадзілі чуткі, што Бона — жахлівая свякруха, якая атрутай звяла ў магілу абедзвюх сваіх нявестак — Лізавету Габсбуржанку і Барбару Радзівілянку.

У схільнасці вырашаць палітычныя пытанні атрутай вінавацілі і суайчынніцу Боны, французскую каралеву Кацярыну Медзічы.

### «Чорная каралева» Францыі

З яе імем звязана адна з самых крывавых старонак у гісторыі Францыі — Барталамееўская ноч. Кацярыну заклеймілі як падступную італьянку, што выконвала парады Макіявелі «забіваць усіх ворагаў адным ударам». Між тым, няма дакументальных звестак, што масавае забойства было спланаванае загадзя. Гісторыкі пішуць, што сітуацыя папросту выйшла з-пад кантролю і пачалася жахлівая разня французскіх каталікоў з французскімі гугенотамі. Каралева Кацярына болей думала пра дынастычныя інтарэсы, чым пра нацыянальныя інтарэсы Францыі. Яе палітыка — шэраг адчайных спробаў утрымаць манархію і дынастыю Валуа на троне любым коштам. Менавіта таму яна лабіравала абранне аднаго са сваіх сыноў, Генрыха, каралём Рэчы Паспалітай.

Як і Бона Сфорца, Кацярына Медзічы паўплывала на тагачасную моду. У 1550 г. каралева забараніла на сваім двары тоўстыя гарсажы. І наступныя 350 гадоў жанчыны ўсёй Еўропы адзявалі гарсэты з матузкамі, каб як мага больш звузіць талію.



**Каралева Бона ў 1517 г., незадоўга да шлюбу з Жыгімонтам.**

### Каралева-рэфарматарка

У ВКЛ інтарэсы кіроўнай дынастыі і інтарэсы дзяржавы не разыходзіліся. Бона здолела ўбачыць, якую небяспеку для Вялікага Княства мае памяншэнне вялікакняскага ўладання. Частка земляў на ўсходзе страцілася ў выніку войнаў з Масквой. У выніку прыбыткі ў дзяржаўны скарб зменшаліся. Магнаты ж багацелі, хацелі большай самастойнасці...

Рэформу, якую пачала Бона, сапраўды можна назваць вялікай. Перамер зямлі адбываўся не толькі на вёсцы, але і ў гарадах, якія яшчэ не валодалі магдэбургскім правам. Фактычна гэтыя гарады таксама атрымалі самакіраванне, бо ў сваіх павіннасцях былі аддзеленыя ад воласці і набылі адміністрацыйную самастойнасць. У некаторых маёнтках прыбыткі вялікакняскага скарбу выраслі ў чатыры разы.

### Таемны шлюб

Ці не найбольшым ударам па аўтарытэце Боны, як і ўвогуле каралеўскай улады, стаў таемны шлюб у 1547 годзе яе сына, ужо абвешчанага вялікім князем, Жыгімонта Аўгуста, з Барбарай Радзівіл, аўдавелай пасля смерці ўплывовага магната Станіслава Гаштольда. Каралева-маці намагалася не дапусціць каранацыі Барбары. Але Жыгімонт Аўгуст, гэты «кароль-заўтра», які любіў адкладаць усе справы на потым, выявіў надзвычайную ўпартасць і настаяў на ўрачыстым узвядзенні жонкі на сталец. Уладная каралева-маці ў абліччы ўласнага сына сутыкнулася сама з сабой. Яе гегемонія ў Вялікім Княстве рухнула.

Гэта стала першым крокам да пазнейшага ад'езду Боны на радзіму, у Італію.

### Італьянцы — «амерыканцы» Рэнесансу

Бона Сфорца, як і Кацярына Медзічы, праз уласны каралеўскі статус сфакусавала на сабе стаўленне да іншаземцаў мясцовых кансерватыўных колаў сваёй новай краіны. Італьянская міграцыя ў Еўропу была досыць вялікая. Італія прадукавала такую колькасць высокакваліфікаваных спецыялістаў у розных галінах, якія не заўжды маглі знайсці сабе заробак на радзіме. Вельмі груба можна параўноўваць статус італьянцаў у тагачаснай Еўропе са стаўленнем да амерыканцаў у сучасным свеце — іх недалюбліваюць, але многія гатовыя ахвотна скарыстацца з іх сацыяльных, эканамічных і тэхналагічных здабыткаў.

Беларусь XVI ст., і ВКЛ увогуле, можа лічыцца прыкладам дабратворнага ўздзеяння італьянскага досведу на мастацкую культуру і прынцыпы гаспадарання. Нягледзячы на супраціў кансерватараў, без якога не абыходзіцца ніводная навацыя, у культурным ландшафце Беларусі ранняга Новага часу італьянскія сляды засталіся вельмі адчувальнымі.

# Гарбачоў: 1985 ды іншыя гады

**25 гадоў таму кіраўнік СССР распачаў эпахальныя змены. Роўных ім не знайсці ў сучаснай гісторыі. Піша Віталь Тарас.**

У ноч на 20 студзеня 1990 года сталіцу Азербайджана Баку штурмам узялі савецкія танкі. Загінулі 134 жыхары горада і 20 салдат, каля сямісот чалавек былі параненыя. Гэтаму папярэднічаў тыдзень армянскіх пагромаў у Баку, ахвярамі якіх сталі не менш за 60 чалавек.

Але пачатак трагічных падзей быў пакладзены яшчэ раней. У лютым 1988 г. у Сцяпанакерце, сталіцы Нагорна-Карабахскай аўтаномнай вобласці (НКАВ), населенай пераважна армянамі, якая ўваходзіла ў склад Азербайджанскай ССР, адбыўся мітынг. Яго ўдзельнікі патрабавалі ўз'яднання з Армянскай ССР. У азербайджанскім Сумгаіце адбыўся першы армянскі пагром, некалькі дзясяткаў чалавек сталі ахвярамі. Следам усчалася хваля этнічных пагромаў у Арменіі і Азербайджане. Пачаўся ўзброены канфлікт, спыніць які не ўдаецца дагэтуль.

У тым жа 1990-м тры балтыйскія рэспублікі абвясцілі незалежнасць: Эстонія (2 лютага), Літоўская Рэспубліка (11 сакавіка), Латвія (4 траўня). А 27 ліпеня 1990 г. Дэкларацыю аб суверэнітэце прымае Беларуская ССР.

У сакавіку таго ж 1990-га чарговы з'езд народных дэпутатаў СССР скасаваў 6-ы артыкул Канстытуцыі аб кіруючай ролі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Усяго за пяць гадоў з таго моманту як Генеральным сакратаром ЦК гэтай партыі стаў Міхаіл Гарбачоў, адбыліся эпахальныя змены, роўныя якім цяжка знайсці ў сучаснай гісторыі.

## У палітбюро ЦК КПСС

На пачатку 1980-х быў папулярны анекдот: — Алё, гэта палітбюро? — Так, палітбюро. — Я хачу ўладкавацца да вас на працу. — Вы што, хворы?! — Так-так! Вельмі хворы і ве-ельмі стары!

Пасля смерці трох састарэлых генсекаў [Брэжнеў, Андропаў, Чарненка], некалькіх сакратароў ЦК і міністра абароны [Дзмітрый Усцінаў] сярэдні ўзрост членаў палітбюро ўсё яшчэ перавышаў нармальныя межы. Сімвалам савецкага маразму на той час была постаць 80-гадовага старшыні Савета міністраў СССР Мікалая Ціханава.

Прэтэндэнтамі на пост генсека ў 1985-м былі першы сакратар Ленінградскага абкама 62-гадовы Рыгор Раманаў і сакратар ЦК, самы малады член палітбюро Міхаіл Гарбачоў, якому тады толькі споўніліся 54.

Гарбачоў стаў генсекам не ў выніку нейкай ідэйнай барацьбы паміж «рэтраградамі» і «прагрэсістамі», але ў выніку звычайнай апаратнай інтрыгі, згодна з традыцыямі ЦК.

Палітбюро сабралася ў Крамлі 10 сакавіка, праз дзве гадзіны пасля смерці Чарненкі. Гарбачоў фармальна прапанаваў узначаліць урадавую камісію па пахаванні генсека першаму сакратару маскоўскага гаркама Грышыну. (Традыцыйна той, хто ўзначальваў такую камісію, пераймаў потым і вышэйшую пасаду.) Але Грышын адмовіўся, разумеючы, што расклад сіл не на яго карысць.

Найбольш уплывовыя на той момант члены палітбюро, брэжнеўскія кадры — кіраўнік кампартыі Казахстана Кунаеў і кампартыі Украіны Шчарбіцкі не паспелі прыехаць на пленум ЦК 11 сакавіка (Шчарбіцкі быў у паездцы ў ЗША). Раманаў адпачываў у Палангзе. Яму паведамілі пра рашэнне палітбюро толькі позна ўвечары 10-га...

Напярэдадні пленума да Гарбачова прыйшоў першы сакратар Свярдлоўскага абкама Ельцын і паабяцаў, калі раптам узнікнуць іншыя прэтэндэнты, адстойваць яго кандыдатуру.

Пасяджэнне палітбюро вёў Раманаў. Грамыка, Грышын, Ціханаў назвалі прозвішча Гарбачова. Беларус Грамыка выступіў і на пленуме. Міністр замежных спраў дыпламатычна не казаў пра дзейнасць Гарбачова на пасадзе сакратара ЦК па сельскай гаспадарцы, гаварыў толькі пра высокія арганізацыйныя і маральныя якасці будучага генсека.

## Чужы

Партыйнае і савецкае начальства, хоць і звыкла прагнулася пад новага «цара», але яго адразу неўзлюбіла. І не толькі начальства. Я ў той час працаваў на БТ у рэдакцыі інфармацыі і памятаю, з якой злой іроніяй адгукаліся «глаўнюкі» пра Гарбачова. Вызначэнне «человек семи пятен во лбу» было, бадай, самым мяккім.

Многіх раздражняла манера генсека выступаць без паперкі, гаварыць безупынна, нікога не слухаючы, перабіваючы іншых на паўслове. Але асаблівую нянавісць выклікала чамусьці жонка Гарбачова Раіса Максімаўна, сам факт, што муж браў яе з сабой паўсюль — і за мяжу, і ў паездкі па краіне. Тое, што ва ўсім свеце было нормай цывілізаваных паводзінаў, у Савецкім Саюзе лічылася ледзь не абразаю годнасці. Як жа з генсекам размаўляць пра важныя справы — не на паляванні, не ў лазні, а ў прысутнасці жонкі? Ды хто яна такая?!

І просты люд не любіў Раісу Максімаўну. Не маглі даравацьёй дарагіх сукенак? Ёй нават прыпісвалі ініцыятыву ўвядзення «сухога закону». Дачасная смерць Раісы Гарбачовай ад лейкозу (раку крыві) у 1999 г. крыху змякчыла застарэлую азлобленасць. Многія ўбачылі, якім цяжкім ударам стаў сыход гэтай жанчыны для Гарбачова, які ўсё жыццё яе кахаў і пражыў з ёй 46 гадоў.

Але Гарбачову не даравалі нічога. Ён рабіў памылкі на кожным кроку. Пачынаючы ад ідыёцкай антыалкагольнай кампаніі, ад маўчання ў першыя дні Чарнобыля, калі ў Мінску і Кіеве адбыліся першамайскія дэманстрацыі пад радыеактыўным даждждом, ад барацьбы з Ельцыным, ад спробаў вырашыць праблемы сілай у Літве, Малдове, Азербайджане, да ад'езду ў Фарос напярэдадні путчу.

Не толькі партнаменклатура, але і ліберальная інтэлігенцыя, якая яму сімпатызавала, неадноначы адчувала расчараванні і крыўду.

Усяго праз некалькі месяцаў пасля прарыўных дэбатаў на З'ездзе народных дэпутатаў у Маскве ён прыязджае ў Мінск, дзе выступае на сходзе партгасактыва ў АН БССР. Там даваўся адлуп «ідэалагічным правакацыям» і спробам «скажэння сацыялізму». Ці не тады ўпершыню прагучала славутая гарбачоўская фраза: «Нам тут падкідваюць!»



## Скажы мне, хто твой сябар...

Напярэдадні Дня Перамогі Гарбачоў выступае з дакладам, у якім даецца станоўчая ацэнка Сталіну як военачальніку. Слова «паскарэнне», як потым і «перабудова» ды «галоснасць» успрымаецца напачатку як палітычная траскатня.

Але Гарбачоў сапраўды быў апантаны ідэяй вяртання да «ленінскага разумення сацыялізму». У гэтым яго падтрымлівалі колішнія шасцідзясятнікі. Ён і сам, па сутнасці, быў шасцідзясятнікам. На Гарбачова ў маладосці моцна паўплывала сяброўства з аднакурснікам па юрыдычным факультэце МДУ Здэнекам Млынаржам, які стаў адным з ініцыятараў Пражскай вясны ў 1968-м.

Вядомы выраз: скажы мне, хто твой сябра — і я скажу, хто ты. У Гарбачова-генсека, аднак, як у кожнага палітыка такога рангу, не было сяброў. А што тычыцца каманды — такое ўражанне, што іх было адразу некалькі. У адной — цвердалобы бальшавік Лігачоў, плаксівы прэм'ер Рыжкоў, невыразны Болдзін, падступны Лук'янаў, абмежаваны Кручкоў, у другой — хітрамудры візір Шэварднадзе, эрудзіраваны начотчык Вадзім Мядзведзеў, інтэлігентны Якаўлеў, у трэцяй — плойма эканамістаў і дарадцаў: Аганбегян, Шаталін, Шахназараў, Чарняеў.

Нікога з іх так не зненавідзелі, як сакратара ЦК па ідэалогіі Аляксандра Якаўлева.

З яго ініцыятывы друкуюцца масавым накладам забароненыя датуль «Жыццё і лёс» Гросмана, «Рэквіем» Ахматавай, «Доктар Жывага» Пастэрнака. Пачынаюць друкаваць Анатолія Рыбакова — «Дзеці Арбата» (крыху пазней выйдзе яго «35-ты і іншыя гады»), кнігі эмігрантаў, у тым ліку, адыёзнага Салжаніцына. Вышэйшую (ленінскую) прэмію атрымлівае «Знак бяды» Быкава.

Вяртаюцца з паліц «спецхрана» фільмы «Праверкі на дарогах», «Камісар», выходзіць фільм Клімава «Ідзі і глядзі» паводле аповесці Адамовіча. На фоне вяртання сапраўдных твораў літаратуры і мастацтва становіцца бачнай цана творчасці афіцыйных савецкіх класікаў.

Але асабліва ненавідзелі Якаўлева за адноўлены працэс рэабілітацыі ахвяраў сталінізму і за вяртанне праўды аб вайне.

Нічога таго не было б без Гарбачова. Вядома, ён быў непаслядоўны. У лістападзе 1986-га патэлефанаваў у Горкі акадэміку Сахараву, дзе той адбываў ссылку, і проста сказаў: «Вяртайцеся ў Маскву». А потым ён жа не даваў выступаць Сахараву на з'ездзе народных дэпутатаў, па-хамску зганяў яго з трыбуны. Бо не хацеў, як і большасць дэпутатаў, слухаць праўду пра вайну ў Афганістане.

Вывад войск з Афганістана, краін Усходняй Еўропы, аб'яднанне Германіі, падпісанне дамовы з ЗША пра абмежаванне стратэгічных узбраенняў-2 (яно і дагэтуль фармальна дзейнічае) — гістарычная заслуга Гарбачова. Захаванне мільёнаў жыццяў, пазбаўленне чалавецтва пагрозы ядзернай вайны. Але гэта — для Захаду.

У Расіі, іншых былых савецкіх рэспубліках ён — увасабленне «найвялікшай геапалітычнай катастрофы ХХ стагоддзя».

Ва ўсе часы народ больш любіў тыранаў — такіх, як Іван Жахлівы, чым цароў-вызваліцеляў і рэфарматараў. А калі ні тых, ні іншых няма, а жыццё ніякае, застаецца толькі настальгія па моцнай руцэ.

За дэмакратыю трэба пастаянна змагацца, а дыктатура гарантуе стабільнасць і яснасць, прымат жывёльнага інтарэсу над духоўным, адсутнасць патрэбы разважаць і рабіць выбар.

Самае цяжкае, калі пішаш пра Гарбачова, — падзяліць, што было перадвызначана гісторыяй, а што сыходзіла непасрэдна ад яго. Гарбачоў не выглядае вялікім палітыкам, выдатным мысліцелем ці паспяховым рэфарматарам. Але, магчыма, яму не даруюць, бо ён быў і ёсць усяго толькі чалавек, адрозна ад «вялікіх», для якіх чалавечае жыццё — нішто.

У Гарбачову дамінуюць чалавечыя рысы — ён не быў наменклатурным робатам. Гэтыя рысы былі яўленыя свету гарбачоўскай эпохай. Якая, на жаль, так і не стала эрай міласэрнасці.

Але за спробу — рэспект.







## Metallica ў Вільні. Арганізуецца паездка

21 красавіка арганізуецца паездка ў Вільню

на грандыёзны канцэрт гурта Metallica.
Тэл: (044) 736–99–64; (029) 232–02–97; (029) 314–14–44

## ІМПРЭЗЫ

### Фестываль «Можна!»

**22 студзеня ў 20.00 у клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** пройдзе фестываль актуальнай беларускай музыкі «Можна!». Выступаюць: **«Срэбнае вяселле»**, **«Адыс Абеба»**, **«Нагуаль»**, **«Касіяпея»**, **Botanic Project**, **«ПартМанэ»**, **CherryVata**. Квіткі: 30 — 50 тысяч рублёў. Даведкі па т.: (029) 700–22–44, (029) 603–40–02.

### Беланогая і іншыя Таццяны

**25 студзеня ў Музеі Максіма Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а)** — Таццянін Дзень. З песнямі, вершамі і прамовамі выступаюць выключна **Таццяны**: **Беланогая**, **Шамякіна**, **Будовіч**, **Шаляговіч**... **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

### Вечарына Леаніда Дайнекі

Творчая вечарына з нагоды 70–годдзя пісьменніка Леаніда Дайнекі пройдзе **29 студзеня ў касцёле Святых Сымона і Алены**. У імпрэзе бяруць удзел пісьменнікі Васіль Зуёнак, Сяргей Законнікаў, Эдуард Акулін, Леанід Дранько–Майсюк. Уздымаць святочны настрой гасцям і юбіляру будуць музыкі: **Зміцер Вайцюшкевіч**, **Алесь Камоцкі**, **Таццяна Беланогая**, а таксама гурт **«Стары Ольса»** і ансамбль народнай музыкі **«Свята»**. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

### Віктар Жыбуль і Джэці з «Князем Мышкіным»

**26 студзеня ў мінскім клубе «Лісіная нара» (вул. Каліноўскага, 32)** — інтуітыўная імправізацыя, авангардная паэзія, адкрытая гукасесія гурта «Князь Мышкін». У вечары возьмуць удзел паэты Віктар Жыбуль і Джэці. Яны разам з «Князем Мышкіным» прэзентуюць кампазіцыю «Ноч з днём пасярэдзіне», заснаваную на творах беларускіх літаратараў 1920–1930–х. Таксама ў праграме — Зміцер План і Ярыла Пшанічны. **Пачатак а 19-й.**

## КАНЦЭРТЫ

### Аляксей Шадзько

**20 студзеня ў 19.00 у КЗ «Мінск» (Малая зала)** выступіць Аляксей Шадзько пры ўдзеле Уладзіміра Ткачэнкі і Ігара Леўчука. Даведкі па т.: (029) 671–58–65, (029) 254–49–09.

### Джаз у «Графіці»

**20 студзеня а 19-й у клубе «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — вечар джаза. Грае Real Jazz Band.

### Блюз у «Графіці»

**21 студзеня а 19-й у «Графіці» — Madera Hard Blues & White Night Blues.**

## ВЫСТАВЫ

### Юдаль Пэн

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12)** праходзіць выстава карцін Юдаля Пэна. Выстава прымеркаваная да 155–годдзя з дня нараджэння мастака. На ёй выстаўленыя 33 працы са збораў Віцебскага краязнаўчага музея. У Мінску яны экспануюцца ўпершыню. Гэта пейзажы, эцюды, партрэты. Менавіта ў партрэце мастак змог найбольш яскрава выразіць сваё майстэрства. Пэн здолеў аднолькава ўдала перадаць характар як арыстакраткі на палатне «Дама з муфтай», так і стварыць вобраз сумнага «Старога палкоўніка з мундзірам». Сярод вучняў Пэна былі Марк Шагал і Заір Азгур. Выстава працуе да 31 студзеня.

### Найлепшае з Цэслера і Войчанкі ў Магілёве

**У Музеі В.Бялыніцкага-Бірулі (Магілёў) да 28 сакавіка** працуе выстава The best of V. Tsesler & S. Voichenko. У экспазіцыі прадстаўленыя творы Уладзіміра Цэслера і Сяргея Войчанкі са збораў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.

### Шчодры куфар

**У Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20) да 26 студзеня** працуе выстава «Шчодры куфар», на якой дэманструецца мастацтва пляцення з саломкі, роспісу і інкрустацыі куфраў саломкай.

### Светлае Свята Раства

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12) да 14 лютага** працуе мастацкая выстава Валянціны Шоба «Светлае Свята Раства».

### Выстава адной карціны

**Да 6 лютага ў Мастацкім музеі** ў рамках праекта «Выстава адной карціны» экспануецца палатно Івана Айвазоўскага «Ноч на востраве Родас».

### Васіль Сумараў і вучні

**У Мастацкім музеі да 15 лютага** працуе выстава «Васіль Сумараў. Настаўнік і вучні».

### Міжнародны фестываль пейзажу

**У галерэях «Ракурс» і «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі да 11 лютага** працуе IV Міжнародны фестываль пейзажу, прысвечаны Віталю Цвірку.

### Поўдзень вакол

**У мінскай галерэі «Свет фота» (вул.Прытыцкага, 10) да 20 студзеня** працуе выстава «Поўдзень вакол» Надзеі Дзегцяровай. Паўднёвая тэма з'яўляецца для фатографа адной з любімых.

## ТЭАТРЫ

**21 студзеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Чычыкаў»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»
**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»

**22 студзеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Сіні аўтамабіль»
**Тэатр оперы і балета** — «Спартак»
**Купалаўскі тэатр** — «Івона, прынцэса Бургундская»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**23 студзеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Па зялёных гурбах акіяна»
**Тэатр лялек** — «Чырвоны Каптурок»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»
**Тэатр оперы і балета** — «Трубадур»
**Тэатр юнага гледача** — «Апошні двубой»
**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»

**24 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр оперы і балета** — «Чыпаліна»
**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Тэатр оперы і балета** — «Алека»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Карусель»

**26 студзеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Я — твая нявеста»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»

**27 студзеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вяртанне галадара»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»
**Тэатр оперы і балета** — «Стварэнне свету»
**Тэатр лялек** — «Дом, які збудаваў Свіфт»

**28 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Чаму старэюць людзі?..»
**Тэатр оперы і балета** — «Чароўная флейта»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»

**29 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Халоднае сэрца»
**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр оперы і балета** — «Рамэа і Джульета»

**30 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Купалаўскі тэатр** — «Гендэль-Бах»
**Тэатр оперы і балета** — «Багема»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»

**31 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Піпі Доўгаяпанчоха»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Гісторыя двух сабак»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»

## КІНО

# Праца — звальняць людзей

**Мне б у неба** (Up in the Air)

ЗША, 2009, каляровы, 109 хв.

**Рэжысёр:** Джэйсан Рэйтмэн

**Ролі выконваюць:** Джордж Клуні, Вера Фарміга, Ганна Кендрык, Джэйсан Бэйтман, Эмі Мортан

**Жанр:** Драма паводле рамана Уолтэра Кірна і сцэнара Джэйсана Рэйтмэна і Шэлдана Цёрнера

**Узнагароды:** «Залаты глобус» за найлепшы сцэнар, намінацыя за найлепшую рэжысуру, фільм, галоўнага актора (Джордж Клуні), актрысу (Вера Фарміга)

**Адзнака:** 5,5 (з 10)




Раян (Джордж Клуні) — менеджэр найвышэйшага звяна, спецыяліст, незаменны ў часы эканамічнага крызісу. Ён звальняе людзей у філіялах сваёй фірмы па ўсім свеце. І робіць гэта звышпрафесійна. Раян не мае ні дома, ні сям'і. Ён літаральна жыве ў самалётах.

Так працягваецца, пакуль маладая кар'ерыстка з яго фірмы не прыдумляе развітвацца з лішнімі супрацоўнікамі з дапамогай відэаканферэнцыі. І спецыяліст па звальненні сам апынаецца пад пагрозай звальнення...

Да таго ж у пералётах Раян пазнаёміўся з прыгажуняй (Вера Фарміга), таксама дасведчанай у аэрапортным жыцці…

Драма Джэйсана Рэйтмана — стрымана–рамантычная, не без гумару.

**Сяргей Мікулевіч**

# Прэс-фота Беларусі 2010

У краіне ладзіцца першы адкрыты незалежны конкурс Прэс–фатаграфіі.

У журы конкурсу ўвайшлі расійскія і літоўскія фатографы, супрацоўнікі вядучых сусветных і нацыянальных фотаагенцтваў.

Графік конкурсу: заяўкі прымаюцца ад 15 студзеня да 15 сакавіка 2010 г.

Праца журы: ад 15 да 30 сакавіка 2010 года.

Цырымонія ўзнагароджання: красавік 2010 г. (дакладная дата будзе аб'яўлена пазней).

Інфармацыя на pressphoto.by.

# Каб бялізна не збягалася

Дапаможнік па пральных сімвалах.

Улюбёны швэдар пачынае належаць хіба на вашага коціка, штаны выходзяць колеру беларускага неба ўзімку (дарма што ў машыну трапілі чорнымі), а станік капітулюе перад сіламі прыцягнення. Усё гэта значыць, што вы не звярнулі ўвагі на пральныя сімвалы.

Яны месяцца на падшэўцы або на цэтліку адзежыны і дапамагаюць прадухіліць непапраўныя міні-аварыі. Каб рэчы не збегліся, не расцягнуліся і не паліналі, азнаёмімся з імі перш, чым загружаць пральную машыну.



### Працэс прання

Гэты знак дае карысную інфармацыю пра тэмпературу і працэс прання. Лічба на ім пазначае максімальную дазволеную тэмпературу прання. Рысачкі пад знакам кажуць пра спосаб выціскання.

Напрыклад, калі на знаку проста лічба 40, гэта азначае, што максімальная тэмпература прання — 40°С, са стандартным замочваннем і звычайным рэжымам выціскання.

Калі пад знакам з лічбай 40 з'яўляецца адна рыска, значыць, паласкаць такую рэч трэба з паступовым ахаладжэннем, а потым выціскаць ва ўмеркаваным рэжыме.

Знак з дзвюма рыскамі рэкамендуе максімальную тэмпературу да 40°С, на самых нізкіх абаротах, звычайнае замочванне, звычайнае выціскание. У дадатак выціскание рукамі забараняецца.

Трапецыя без лічбы, але з далонькай пазначае, што гэтую вопратку трэба мыць пры тэмпературы 40°С у рэжыме далікатнага прання.



Дадатковая версія знака, перакрэсленая крыжыкам і без ніжніх рысак, сведчыць, што гэтай адзежыне нельга ў пральную машыну. З ёй трэба абыходзіцца асцярожна, калі яна вільготная.

### Працэс адбельвання

Трохкутнік пазначае працэс адбельвання. Калі ў трохкутніку з'яўляюцца літары Cl, дык такую вопратку можна адбельваць рэчывам на аснове хлору ў халодным і добра размяшаным растворы. Калі трохкутнік перакрэслівае



крыжык — адбельваць забаронена.

### Прасаванне, сушка і хімчыстка



Знак у форме праса рэкамендуе пажаданую тэмпературу, пры якой можна прасаваць рэч. Калі ў прасіку адна кропачка, значыцца, рэч можна прасаваць пры гарачыні да 110°С. Дзве кропачкі — да 150°С. Тры — 200°С. Сімвал «Х» на прасіку азначае забарону прасавання і апрацоўку парай.



Знак у выглядзе кольца, у якое ўпісаная лацінская літарка, рэкамендуе распушчальнікі, прыдатныя для хімічнай чысткі гэтай рэчы. Напрыклад, літара А пазначае, што дазваляецца без абмежавання выкарыстоўваць усе распушчальнікі з дадаткам поліхлорэтылену. Літара Р дазваляе чыстку з дапамогай поліхлорэтылену, тэтрахлорэтылену, монафлорполіхлорметану, а F — поліхлорэтану, монафлорполіхлорметану і белага спірту (з тэмпературай чысткі ад 150°С да 210°С).

Калі літары ў колцы падкрэслівае ніжняя рыска — самастойная чыстка забароненая. Не мудруючы, нясіце рэч у грамадскую хімчыстку.



Колца ў квадраце азначае, што памытыя рэчы можна сушыць у сушыльнай машыне. Градацыя тэмпературы максімальнай сушкі пазначаная чорнымі кропкамі. Адна кропка — можна сушыць пры нізкіх тэмпературах. Дзве — дазваляецца звычайны працэс сушкі. Крыжык пазначае забарону сушыць дадзеную рэч у сушыльнай машыне.

Жывіце мудра!

**Ліза Кавальчык**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Пячэнне стогадовае

100 г масла, 6 яек, 200 г цукру, цэдра 1 лімона, 200 г бульбяной мукі*

Узбіць добра масла, дадаць яйкі па адным, цукар, нацёртую цэдру, бульбяную муку, добра перамяшаць, выкласці на бляху пячэнне купачкамі памерам з грэцкі арэх і спячы ў духоўцы на лёгкім агні.

* Бульбяную муку часта блытаюць з крухмалам. Гэта не адно і тое ж. Для гэтага рэцэпта патрэбна менавіта бульбяная мука.

**З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858, пераклала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ПАДАРОЖЖЫ**

**Запрашаем** у падарожжа Прага — Дрэздэн 3—7 лютага. Т.: (017) 292-54-58.

**Запрашаем** у вандроўку 24 студзеня па маршруце: Мінск — Княжыцы — Вейна — Дашкаўка — Магілёў — Мінск. Т.: (029) 111-73-32, (017) 262-73-43.

**ПРАДАМ**

Ровар спартовы 18-ціхуткасны, новы, блакітнага колеру, ёсць сумка, фляга, люстэрка, налепкі — «Свабода», «Еўразвяз» і г.д. Не дужа дорага (450 тыс. бел. руб.). Т.: 223-21-81, (025) 999-24-33. Слава.

**ПРАЦА**

**Электраманцёр** шукае працу па электрамантажы разетак, выключальнікаў, электраправодкі. Т.: (017) 294-02-02.

**Прапаноўваю рэпетытарства па** беларускай мове (вуснае маўленне, граматыка). Для любога ўзросту. Вольга. Т.: (029) 716-81-71.

**ЦІШОТКІ**

**Пытайцеся** «Цішоткі вольных Беларусаў» (http://tishotka.blog.tut.by) на сядзібе Таварыства беларускай мовы (Румянцава, 13, ад 15-й да 18-й) і на Сядзібе Партыі БНФ (Машэрава, 8, ад 10-й да 20-й). Таксама замаўляйце цішоткі ў інтэрнэт-краме prastora.by.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!



# Знойдзены гармон абжорства

Чаму некаторыя людзі хочуць есці, нават калі яны сытыя? Гэта высвятляла група даследчыкаў з Паўднёва-заходняга медыцынскага цэнтра Тэхаскага ўніверсітэта (ЗША).

Арганізм, калі ён галодны, выпрацоўвае спецыяльны гармон голаду — грэлін. Часам яго выпрацоўваецца столькі, што чалавек і наеты працягвае піхаць у сябе новыя і новыя стравы.

Грэлін выпрацоўваецца яшчэ і з пры недасыпе. Арганізм спрабуе кампенсаваць недахоп сну калорыямі. І наадварот, калі чалавек спіць, яго арганізм выпрацоўвае лептын, што прытупляе апетыт. Каб менеі есці, трэба болей спаць.

**СХ**

# Збор сродкаў у дапамогу пацярпеламу насельніцтву Гаіці

Чырвоны крыж заклікае беларусаў далучыцца да міжнароднай супольнасці ў зборы сродкаў у дапамогу пацярпеламу ад землятрусу насельніцтву Гаіці і Дамініканскай Рэспублікі.

Грамадзяне Беларусі, а таксама арганізацыі і прадпрыемствы любых формаў уласнасці могуць пералічыць грошы на рахунак:

3015200990017 у філіяле МГД ААТ «Белінвестбанк», г. Мінск, код 764, УНП 100265026, з пазнакай «Дапамога Гаіці».

Грашовыя сродкі будуць пералічаныя ў Міжнародны Камітэт Чырвонага Крыжа і Міжнародную Федэрацыю Таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца, якія каардынуюць усю працу Міжнароднага руху Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца і аказваюць экстраную дапамогу насельніцтву ў эпіцэнтры землятрусу.




Неабходную інфармацыю можна атрымаць на сайтах www.icrc.org і www.ifrc.org. Або па т.: (17) 227-66-82; (029) 116-30-21 (Ірына Каранчук, Чырвоны Крыж).

**НШ**

## Газетка дзеткам





Весяліцца не магу,
Калі ты на ланцугу,
Бо ніколі друга друг
Не навяжа на ланцуг.

**Алесь Пісьмянкоў**
**Больш вершаў на dzietki.org**

## КЕМІКІ

**Якія імёны схаваліся ў гэтых словах?**

| | |
|---|---|
| Беганіна | Хусцінка |
| Радзіма | Прагаліна |
| Таполя | Верабей |
| Хваля | Калена |



PHOTO.BYMEDIA.NET

**У Мінску адчыніўся першы 3D-кінатэатр «Кіеў». Дзякуючы спецыяльным акулярам, карцінка на экране здаецца аб'ёмнай. На фота: наведнікі «Кіева» перад першым паказам фільма «Аватар».**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Байцоўскі клуб па-беларуску: арганізатары памятных летніх бітваў падушкамі зладзілі 17 студзеня ў скверы Янкі Купалы бойку снежкамі. Праз інтэрнэт удалося сабраць сорак удзельнікаў. Бойкі падушкамі былі больш масавыя, мо таму, што мелі культурна-гістарычную прывязку: ладзіліся ў дні Грунвальдскай і Аршанскай бітваў.**



**Іспанскі палітык-камуніст Гаспар Л'ямасарэс заявіў, што ФБР выкарыстала яго фатаграфію ў якасці асновы для стварэння фotаробата лідэра «Аль-Каіды» Усамы бен Ладэна. Усёмагутнае ФБР павінілася. Калі інфармацыя пра халтуршчыкаў з ФБР трапіла ў прэсу, Дзярждэпартамент ЗША загадаў прыбраць з Інтэрнэта фотаробат.**




REUTERS

**У Турцыі падчас прэзентацыі Кнігі рэкордаў Гінэса сустрэліся самы высокі і самы маленькі чалавек на зямлі — 27-гадовы былы баскетбаліст з Турцыі Султан Косен (2 м 46,5 см) і 21-гадовы кітаец Хі Пінгпінг (70 см).**



SVABODA.ORG

**Некалі англійскі кароль быў валадаром свету. Сёння ён — накшталт зоркі шоу-бізнэса. На фота: брытанскі прынц Гары наведвае Новую Зеландыю.**




**Амерыканская спявачка Мэрая Кэры на 67-й цырымоніі ўручэння «Залатых глобусаў», дзе фантастычны фільм «Аватар» быў названы найлепшай драматычнай кінастужкай.**

## АНЕКДОТЫ

* * *

— Спадарыня, дазвольце вам дапамагчы.

— Дзякуй, у мяне няцяжкія сумкі.

— Увогуле, я пластычны хірург...

* * *

Наймацней і найхутчэй чалавек засынае пасля таго, як адзвінеў будзільнік.

* * *

— Я працую на дзве стаўкі!

— Майго заробку таксама хапае толькі на пару ставак у казіно...

* * *

— У вас ёсць комплексы?

— Так, ёсць крыху...

— Мы выратуем вас ад любых комплексаў! І ваша жыццё зробіцца намнога лепшым!

— Сумняваюся, што буду жыць лепей без маіх нафтаперапрацоўчых комплексаў...

* * *

— Што такое цэ о два?

— Па-беларуску — вуглякіслы газ, а па-ўкраінску — гэта проста кісларод.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**М.Хоцімск, Магілёўскай губ.** Жывём мы ў суседстве з Расіяй. Калісь тут ракой Бесяддзю ішла граніца Беларусі і Літвы з Масквой. Акопы, што даўней баранілі наш край ад ворагаў, ужо раўнаюцца з зямлёй; на іх жа мейсцы вырастаюць у кожнай вёсцы народныя школы, гэтыя сучасныя і будучыя нашы крэпасці, дзе гартуецца будучыня нашай бацькаўшчыны, яе культурная сіла.

**«НН». №1. 1910**

**2000 год можа стаць** годам адкрыцця першага беларускага нацыянальнага ўніверсітэта, — паведаміў старшыня ТБМ Алег Трусаў — на ўзор французскае Сарбоны ці брытанскага Кембрыджа. Ужо набылі абрысы статутныя палажэнні новае ўстановы. Яна мае рыхтаваць адмыслоўцаў у двух кірунках: навуковыя кадры для Акадэміі навук і менеджэры для гаспадаркі краіны. Эканамічным факультэтам мае кіраваць акадэмік трох замежных акадэміяў прафесар эканомікі Сямён Шарэцкі. Кіраўнік ініцыятыўнае групы Алег Трусаў сказаў, што першы нацыянальны ўніверсітэт будзе дзяржаўным.

**«НН». №3. 2000**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

**© НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6300.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 20.01.2010.
Замова № 259.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10003